Літ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

12 лістапада 2004 г. № 45/4281

АНОНС!

"У нас шмат агульнага"

Скандынавы заўсёды былі людзьмі моцнымі, уплывовымі і... сціплымі. Адкрыўшы Амерыку за стагоддзі да Калумба, яны падаравалі лаўры першынства паўднёваму еўрапейцу; былыя тэрыторыі агромністага некалі Шведскага Каралеўства цяпер уваходзяць у склад многіх суседніх дзяржаў. Што яшчэ яднае нашчадкаў ліцвінаў з нашчадкамі вікінгаў? На гэтае і іншыя пытанні адказвае кіраўнік аддзялення маскоўскага Пасольства Швецыі ў Мінску сп. Ян ШАДЭК.

СТАР. 4-5

Папярэднія пісьменніцкія пакаленні мелі за рэальную аснову творчасці і асабістага духоўнага фарміравання вёску. Вёска была крыніцай нацыянальнай мовы, псіхалогіі, побыту, нацыянальнага духу. Са знікненнем традыцыйнай вёскі знікае рэальная жыццёвая аснова нацыянальнага бытавання народу. Горад жа заўсёды быў у значнай меры касмапалітычным. А сучасны наш горад, па сутнасці, пазбаўлены нацыянальнага аблічча. Ёсць дзяржава, народ без пэўна выяўленай нацыянальнай ідэнтычнасці. У такіх умовах асноўнай, калі не адзінай, крыніцай нацыянальнага сілкавання, а тым самым і ўратавання, становіцца гісторыя.

Серафім АНДРАЮК

СТАР. 7

Ён сэрцы песняй атуляе...

Днямі Прэзідэнт Беларусі ўручыў высокія дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных прафесій, розных сфер дзейнасці. Сярод лепшых людзей краіны, ганараваных кіраўніцтвам дзяржавы, — прадстаўнікі прамысловасці, праваахоўных органаў, юрыспрудэнцыі, медыцыны, вайскоўцы і педагогі, дзеячы культуры і мастацтва. У іх ліку — і адзначаны Падзякай Прэзідэнта папулярны артыст айчыннай музычнай эстрады Якаў НАВУМЕНКА.

Штодня гучыць у эфіры яго пранікнёны голас, узнімаюць настрой светлыя песні-ўсмешкі, лагодзіць душу яго спеўны аповед: пра залатую восень, пра зорку Венеру, пра наш адзіны родны край, пра вечнае і ва ўсіх непаўторнае каханне...

Фота М.Замулевіча

Зноў "Paragis"...

16 лістапада ў Мінску — аўкцыён! Другі раз антыкварна-аўкцыённы Дом "Paragis" ладзіць пад патранатам сталічнай мэрыі, Міністэрства культуры РБ і пры падтрымцы кампаніі "Siemens" (генеральны спонсар) сваю акцыю, якая, у адрозненне ад першай, праведзенай увесну, прадстаўляе на продаж не толькі творы сучаснага мастацтва, але і антыкварыят. У памяшканні Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, дзе адбудзецца аўкцыён, разгорнута выстаўка жывапісу, ювелірных вырабаў, букіністыкі XV-XX стст., манет III ст. да н.э., антычнага мастацтва, фалерыстыкі, работ сучасных жывапісцаў, графікаў, скульптараў, фотамайстроў. На продаж выстаўляецца 352 лоты, у тым ліку творы вядомых нашых мастакоў У.Стальмашонка, С.Каткова, І.Дмухайлы, А.Кроля, рарытэтны мужчынскі партрэт, выкананы заснавальнікам Віцебскай мастацкай школы Ю.Пэнам (стартавая цана — 2.5 — 3 тыс. долараў ЗША), залатая падвеска з 11 брыльянтамі, 2 гранатамі, прыроднай шпінеллю, кошт якой ацэньваецца ў 850.000$, 64 тамы знанага слоўніка Бракгауза ды Эфрона, адзін том якога ацэньваецца ў 18 — 20$. Арганізатары аўкцыёна спадзяюцца на яго карысць і для людзей, якія могуць дазволіць сабе задавальненне — купляць прадметы мастацтва, і для аўтараў сучасных твораў, і для дзяржавы.

С.Б.
Фота К.Дробава

Тэатр — для аматараў

Чатыры дні праходзіў у Маладзечне III Рэспубліканскі фестываль аматарскага тэатральнага мастацтва "Тэатральныя скрыжаванні". У межах яго праграмы, апроч работ 15-ці самадзейных тэатральных калектываў, быў паказаны спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы "Я не пакіну цябе", адбылася творчая сустрэча з народнымі артысткамі Беларусі Н.Гайдай ды М.Захарэвіч і заслужаным артыстам РБ У.Мішчанчуком, прайшло абмеркаванне праблем развіцця аматарскага тэатра ў нашай краіне. Журы на чале з М.Захарэвіч вызначыла прызёраў, дыпламантаў, лаўрэатаў фестывалю. Гран-пры атрымаў узорны тэатр-студыя "Паралель" Палаца дзіцячай творчасці г.Баранавічы (рэжысёр Л.Салтакова). Спецыяльным прызам Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі адзначаны госці з Літвы — Малы тэатр г.Кельмі (рэжысёр А.Армонас).

С. ВЕТКА

10 год на Беларусі: Беларуска-польскае ўзаемадапаўненне.

У кастрычніку ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася міжнародная выстава "10 год у Беларусі: выданні Польскага інстытута. Паланістыка ў Беларусі. Беларусістыка ў Польшчы", падрыхтаваная музеем сумесна з Польскім інстытутам і Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў. Яна прысвечана беларуска-польскаму і польска-беларускаму культурнаму супрацоўніцтву.

Дзесяцігадовы юбілей дзейнасці Польскага інстытута ў Мінску — нагода для стварэння выставы. У той жа час, карані ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі вельмі даўнія і трывалыя, літаратурныя сувязі і культурныя ўзаемадачыненні сягаюць у глыбіню стагоддзяў. Узнікшы на перакрыжаванні ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай традыцый, беларуская культура на працягу значнага часу характарызавалася ўзаемадзеяннем розных нацыянальна-культурных напластаванняў, але сувязі з польскай культурай былі надзвычай цеснымі. Так, развіццё палемічнай літаратуры 2-ой паловы XVI — пачатку XVII стст. было непасрэдна звязана з польскім уплывам, таксама як і распаўсюджанне ў пазнейшы час стылю барока. Беларуска-польскія традыцыі знаходзяць у творчасці М.Гусоўскага, С.Полацкага, К.Марашэўскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, А.Рыпінскага, А.Міцкевіча, Я.Чачота... Узаемапранікненне культур, заснаваных на агульнасці традыцый, наклала адбітак на спецыфіку дзейнасці Польскага інстытута ў нашай краіне: арыентацыя на супольныя праекты, папулярызацыя беларуска-польскіх сумесных дасягненняў.

На выставе прадстаўлена больш за 200 выданняў. Каля сямідзесяці з іх выйшлі з дапамогай Польскага інстытута: гэта працы па гісторыі выдавецкай дзейнасці, матэрыялы міжнародных канферэнцый і сімпозіумаў, навуковыя зборнікі, мастацкія творы, нотныя выданні і інш. Сярод навуковых і навукова-папулярных выданняў — выпускі "Беларуска-польскага практыкума", "Кантактаў і дыялогаў" і інш. Звяртае на сябе ўвагу беларускі нумар часопіса "Культура" (Парыж) прысвечанага Ежы Гедройцу, яго рэдактару і заснавальніку, нашаму суайчыннику (нарадзіўся ў Мінску ў 1906 годзе), вядомаму публіцысту, які на працягу 50 год імкнуўся да наладжвання добрасуседскіх адносін паміж нашымі краінамі (пра яго распавядае таксама плакатная фотавыстава). Мастацкая літаратура шырока прадстаўлена польскамоўнымі творамі ў беларускіх перакладах (Р.Барадуліна, А.Лойкі, У.Мархеля, Я.Міклашэўскага, С.Мінскевіча і інш.). Гэта як польская літаратура, так і літаратура нашага сумежжа: паэзія Ул.Сыракомлі, А.Міцкевіча, І.Дамейкі, Я. Баршчэўскага і інш. Сярод твораў беларускай літаратуры і першае выданне асобнай кнігай польскіх вершаў Янкі Купалы ў арыгінале і ў перакладзе на беларускую мову. Дзякуючы плённаму супрацоўніцтву з інстытутам выйшлі шэраг нотных выданняў (рамансы С.Манюшкі на вершы Ул.Сыракомлі, балады на словы Адама Міцкевіча), папулярныя музычныя выданні (у прыватнасці, "Беларускі рок-н-рол", прысвечанае гісторыі беларускага рока), а таксама некалькі кампакт-дыскаў. На выставе дэманструюцца музычныя праекты Яўгена Паплаўскага, аднаго з заснавальнікаў "Беларускай капэлы": з мэтай пошуку і ўвядзення ў выканальніцкую практыку старадаўняй беларускай музыкі ён неаднаразова працаваў у архівах бібліятэк Кракава, Варшавы і Познані.

Не менш шырока прадстаўлены даследаванні, кнігі, часопісы Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў за 10 год. Гэта выданні, прысвечаныя беларускаму ўплыву ў галінах гісторыі, літаратуры, культуры: "Беларусь паміж Усходам і Захадам", "Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый", "480 год беларускага кнігадрукавання", "Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы", працы, прысвечаныя Яну Чачоту, Ігнату Дамейку, выданні сяброў асацыяцыі і інш. На думку Прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў прафесара Адама Мальдзіса, такі бок узаемадачыненняў паміж нашымі культурамі — беларуска-польскі — з'яўляецца вельмі цікавым і шматгранным: "У мяне даўно ёсць ідэя стварыць даведнік — што далі беларускія землі польскай культуры. Няхай бы такія інстытуты працавалі ў іншых краінах для пашырэння беларускай культуры ў свеце..."

Дырэктар Польскага інстытута ў Мінску Цэзары Карпінскі адзначыў на прэзентацыі, на якую сабраліся шмат літаратуразнаўцаў, перакладчыкаў, гісторыкаў, артыстаў, што польска-беларускае ўзаемасупрацоўніцтва павінна працягвацца і надалей як "дыялог творчай інтэлігенцыі", як "працэс на шмат гадоў і шмат пакаленняў". Прадстаўленыя на экспазіцыі літаратурныя творы і выданні — яскравае сведчанне плёну і добраўплыву такіх культурных узаемадачыненняў.

Ірына ЛАПЦЁНАК

На Дзяды — да Васіля Быкава

Урачыстае адкрыццё памятнага знака на магіле народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава адбылося 2 лістапада на Дзяды — у Дзень памінання продкаў — на Усходніх (Маскоўскіх) могілках сталіцы.

Паўтараметровы надмагільны валун быў прывезены з балтыйскага ўзбярэжжа Фінляндыі, дзе болей за два гады знаходзіўся наш славуты празаік. Тады ж ён прыкмеціў гэты камень і выказаў пажаданне-запавет мець яго на сваёй магіле за помнік. Пра гэта расказалі паэт У. Някляеў, што апекаваўся дастаўкай фінскага валуна на Беларусь яшчэ ў чэрвені, да ўгодак з дня смерці Васіля Быкава, ды амбасадар Фінляндыі Ціма Лахема, які расказаў пра фінскіх майстроў-скульптараў, што абраблялі камень, падораны мэрыяй горада Хельсінкі. На валуне апроч бронзавага факсімільнага подпісу пісьменніка "Васіль Быкаў" і датаў нараджэння і смерці празаіка болей нічога няма. Мінімалізм формы надае помніку шчымлівую самотнасць і велічнасць.

А распачалася ўрачыстая дзея з малебна, што адслужыў уніяцкі святар Андрусь Абламейка, які ў чэрвені мінулага года адляваў слыннага сына беларускай зямлі. Далей слова ўзяў старшыня праўлення Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, які распавёў пра жыццёвы і творчы шлях Васіля Быкава. Ля помніка выступілі амбасадары Літвы Ёнас Паслаўскас ды ЗША — Майкл Крол, а таксама беларускія пісьменнікі. Усе, хто прыйшоў з кветкамі і вянкамі, усклалі іх да помніка і запалілі памінальныя свечкі.

А. ГАЎРОН
Фота К. Дробава



Інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі — 75

Адна са старэйшых навукова-даследчых устаноў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа — адзначае сваё 75-годдзе. Інстытут быў створаны 2 лістапада 1929 года рашэннем Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук на базе мовазнаўчых кафедр і камісій, што існавалі ў структуры Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). У склад яго тады ўваходзілі камісіі: тэрміналагічная, па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы, дыялекталагічная, па ўкладанні гістарычнага слоўніка, правапісная. У рабоце камісій прымалі ўдзел акадэмікі З.Жылуновіч (Цішка Гартны), І.Луцэвіч (Янка Купала), К. Міцкевіч (Якуб Колас). Асноўнымі супрацоўнікамі былі П.Бузук, І.Бялькевіч, І.Воўк-Левановіч, А.Гурло, Я.Лёсік, С.Некрашэвіч, Б.Эпімах-Шыпіла.

Інстытут літаратуры, мовы і мастацтва ў выніку структурнай рэарганізацыі ў маі 1952 года выдзеліўся як самастойная навукова-даследчая ўстанова Акадэміі навук БССР. У 1956 годзе яму прысвоена імя народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

У пасляваенны перыяд у інстытуце былі створаны слоўнікі, якія адыгралі вялікую ролю ў справе нармалізацыі беларускай літаратурнай мовы: "Руска-беларускі слоўнік" (1953), "Беларуска-рускі слоўнік" (1962). Упершыню ў гісторыі беларускага мовазнаўства створаны пяцітомны (у шасці кнігах) "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" (1977 — 84).

За комплекс прац па дыялекталогіі ("Дыялекталагічны атлас беларускай мовы", 1963; "Нарысы па беларускай дыялекталогіі", 1964; "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак", 1968 — 69 аўтарскі калектыў быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР 1971 г., а за пяцітомны "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" дыялектолагі атрымалі Дзяржаўную прэмію Беларусі, 2000 г.

У Інстытуце мовазнаўства атрымалі развіццё розныя навуковыя напрамкі, сфарміраваліся ўласныя навуковыя школы: лінгвагеаграфічная (заснавальнік прафесар П. Бузук), славістычная (заснавальнік В. Мартынаў), анамастычная (заснавальнік акадэмік М. Бірыла), гістарычная (заснавальнік І.Воўк-Левановіч), фанетычная (заснавальнік акадэмік А.Падлужны), словаўтваральная і соцыялінгвістычная (заснавальнік прафесар А. Лукашанец) і іншыя.

Інстытут ажыццяўляе каардынацыю навукова-даследчай работы мовазнаўчых кафедр вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Пры ім ёсць аспірантура і дактарантура па падрыхтоўцы кадраў, спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый.

У розныя часы Інстытут узначальвалі дырэктары: С. Некрашэвіч, П. Бузук, А.Александровіч, В. Вольскі, В. Барысенка, К. Крапіва, П. Глебка, М. Суднік, А. Жураўскі, А. Падлужны. Цяпер дырэктарам інстытута з'яўляецца доктар філалагічных навук, прафесар А. Лукашанец.

Сёння Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі застаецца вядучай навуковай установай, у якой праводзяцца фундаментальныя даследаванні па надзённых праблемах беларускай мовы, рыхтуюцца рознага роду лексікаграфічныя даведнікі, якія маюць выключна важнае значэнне для моўнай практыкі.

Н.К.

Выстава пад такой назвай адкрылася ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Яе аўтар — скульптар, мастак, пісьменнік Алесь Шатэрнік.

Сапраўдныя барвы, дый не толькі — але ўсе фарбы восені, яркія, шматколерныя, стракатыя на карцінах аўтара, ад якіх, здаецца, чутны нават пахі, подых панны Восені, а яшчэ яе гукі. "Муза мая маўклівая", — сцвярджае мастак, таму і бярэцца часам за ручку замест пэндзля, каб выказаць свае думкі і пачуцці не толькі на халсце, у скульптуры, але і на паперы.

"Імпрэсіі. Барвы восені"

На адкрыццё выставы сабралася творчая інтэлігенцыя, мастакі, мастацтвазнаўцы, сябры, навучэнцы мастацкай студыі. Спадар Шатэрнік у адказ на добрыя словы вітаў усіх сваім словам — паэтычным. І хаця аўтар сцвярджае пра імпрэсіяністычны пачатак у сваёй творчасці, усё ж яго карціны, як і іншыя творы, зразумелыя і блізкія кожнаму, бо ў іх праз індывідуальнае паказваецца агульнанацыянальнае, агульначалавечае: наша слаўная гісторыя, прыгажосць зямлі беларускай, выдатныя імёны айчыны.

Літаратурны музей М.Багдановіча і Алесь Шатэрнік запрашаюць вас на выставу "Імпрэсіі. Барвы восені. Скульптура. Жывапіс. Слова." да 15 лістапада.

Святлана КІСЛОВА,
загадчык экскурсійна-масавага аддзела Літаратурнага музея М.Багдановіча

З адной паездкі

Яшчэ ў дарозе думалася: гэта шчасце — трапіць у Белавежскую пушчу. І незалежна, у якую пару года... Нават увосень, калі ўжо няма той вясёлай зялёнай раскошы, калі дрэвы стаяць задуменныя, з нейкай годнай урачыстасцю, якая нібы гаворыць, падкрэслівае: мы зрабілі сваю справу, падраслі за лета, падужэлі, цяпер не грэх і адпачыць у лісцяной пазалоце.
Сапраўды, веліч амаль некранутага рукой чалавека леса, старажытнага куточка нашай Радзімы ўражвае незвычайна. Асабліва, калі бачыш, як цягнуцца ўгору, у блакіт неба спічастыя елкі і клёны, высачэзныя бярозы, калі з сяброўскай прыязнасцю акружае цябе каланада магутных дубоў, узрост якіх нават цяжка вызначыць — колькі ім, трыста, чатырыста гадоў? А, можа, і ўсе семсот, як тутэйшаму цар-дубу, шурпаты ствол якога не абдымуць і пяць чалавек.

І сярод гэтага хараства прыроды — нашы пагранічныя заставы... Значная частка Белавежскай пушчы знаходзіцца на тэрыторыі ўжо другой дзяржавы, Польшчы. Менавіта сюды, да пагранічнікаў, завіталі мы, невялічкая група пісьменнікаў, пакінуўшы за сабой сотні кіламетраў. Прыехалі па гасцінным запрашэнні — убачыць, пазнаёміцца з вартавымі граніцы, выступіць перад імі, напісаць пра іх баявыя будні, справы. Разам з намі — шаноўныя нашы спадарожнікі: прадстаўнік Дзяржкамітэта пагранвойск РБ Віктар Васільевіч Плісік і старшы афіцэр аддзела маральна-псіхалагічнага забеспячэння Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групы імя Ф.Э.Дзяржынскага маёр Алег Барысавіч Дубянецкі.

Першая застава, якую мы наведалі, і называецца першай... Яшчэ ў дарозе нас папярэдзілі, каб не дужа здзіўляліся: ідзе натуральнае абнаўленне кадраў, на заставах кіраўнікі-камандзіры пераважна маладыя, за плячамі якіх нядаўняя вучоба на пагранічным факультэце Вайсковай акадэміі рэспублікі. І ўсё ж, калі расчыніліся жалезныя вароты, і да нас подбегам наблізіўся невысокі, падобны на падлетка афіцэр, нам цяжка было стрымаць здзіўленне. З-пад моднай цяпер шырокай, з высокім верхам зялёнай фуражкі выглядаў жывы круглы тварык, на якім блукала збянтэжаная ўсмешка.

— Ну, вось гэта і ёсць гаспадар... Начальнік заставы Кучарук Мікалай Васільевіч, — прадставіў кожнага з нас маёр. — Службовы стаж у яго невялікі, але...

У гэтае "але" быў укладзены такі значны змест, што мы адразу пастражэлі і ўжо з павышанай павагай пачалі слухаць гаспадара і аглядаць ягоную сядзібу.

Сядзіба, як сядзіба. Строгая тыповая казарма, надворныя пабудовы, жыллёвы асабняк. Вакол — лес... Выключная прыгажосць, да якой відаць, пагранічнікі прывыклі. А цішыня такая — у вушах звініць. Тут жа, за сядзібай, кантрольна-следавая паласа, драцяная сігнальная агароджа ўздоўж прасекі знікае ў гушчары за паваротам... Вось, аказваецца, дзе ён, край нашай роднай беларускай зямлі! Тая дзяржаўная граніца, якую так пільна, старанна і самааддана ахоўваюць воіны днём і ноччу, у летнюю спякоту і ў зімовыя маразы. У любы час, на любым участку можа ўзнікнуць трывожная сітуацыя. А даручаны ўчастак граніцы — не маленькі, цягнецца больш, чым на дзесяць кіламетраў, ды маладыя ногі і пільныя вочы не ведаюць стомы.

І ўжо потым, калі мы сядзелі ў кабінеце начальніка заставы, і ён нам расказваў пра службова-аператыўную дзейнасць яго падраздзялення, сэрца радавалася маладому, не па гадах мудраму і дзелавому чалавеку. Пакуль, як кажуць, Бог літасцівы, асаблівых парушэнняў граніцы на ўчастку не было. Але хто ведае, калі можа з'явіцца парушальнік? Таму і надаюць тут асаблівую ўвагу інтэнсіўнай падрыхтоўцы пагранічнікаў да дзеянняў у экстрэмальных умовах, дакладнаму і бездакорнаму веданню сваёй справы.

Вечарам, пасля літаратурнага выступлення, мы назіралі, як перад строем пагранічнікаў начальнік заставы даваў заданне кожнаму на наступны дзень... І ўжо гэта быў нібыта зусім іншы чалавек: стрыманы, засяроджаны, з разуменнем важнасці моманту. Здавалася, цяпер ён і вышэйшы ростам, і больш самавіты. Сапраўдны камандзір, адказны за свае рашэнні і загады, якога падпарадкаваныя разумеюць з паўслова.

А назаўтра, перад ад'ездам з гасцінай заставы, ён канчаткова пакарыў нас: мы адкрылі ў ім чалавека тонкай, чулай душы. Як любіць родную прыроду, з якім замілаваннем знаёміў нас з Белавежскай пушчай, гэтым унікальным куточкам палескага краю! З якім гонарам паказваў векавечны, магутны цар-дуб, які быў сведкам незлічоных малых і вялікіх гістарычных падзей на нашай зямлі! А потым, на заставе, лагодна знаёміў нас са сваімі гадаванцамі — маладой прыгожай аўчаркай і... аляняці Барысам. Так, так, падабралі кволага, бездапаможнага аляня ў лесе, выхадзілі, паставілі на ногі. І цяпер ён, агульны любімец, жыве на заставе са статкам кароў, а прызнае толькі Мікалая Васільевіча, прымае корм толькі з яго рук...

Вось такі ён, начальнік заставы Мікалай Кучарук, і камандзір, і настаўнік-выхавацель маладых пагранічнікаў.

Наведалі мы іншыя кропкі аховы дзяржаўнай граніцы на Брэстчыне. Не буду хаваць — хоць і трэба было праехаць вялікую адлегласць — папрасілі мы кіраўнікоў нашага журналісцкага рэйду абавязкова завярнуць на заставу "Казімірава": кожны марыў пабываць на ёй, пазнаёміцца з тым участкам граніцы, дзе служыў наш шаноўны Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка... З якім хваляваннем і цікавасцю мы слухалі расказ пра колішняга пагранічніка, славутага чалавека, з якога, па сутнасці, пачалася сучасная і наша дзяржаўнасць, і армія! Пра тое, як Прэзідэнт некалькі гадоў таму наведаў сваю родную заставу... Гарталі альбом са здымкамі Аляксандра Рыгоравіча і здавалася, што ён побач — з адкрытым і добрым тварам, зычлівым і мудрым позіркам.

Прыемна было ўсведамляць, што слаўныя баявыя традыцыі заставы працягваюцца. Гэткія ж, як і раней, маладыя, энергічныя, верныя свайму воінскаму абавязку перад Радзімай, пагранічнікі годна нясуць службу, у пэўных складаных сітуацыях па затрыманні парушальніка праяўляюць кемлівасць і мужнасць. Параўнаўча не так даўно памаглі нават сваім суседзям — 3-й заставе адлавіць злоснага злачынцу, які меў намер перайсці граніцу.

— Застава наша на добрым рахунку... Будзем усё рабіць, каб так было і далей, — у адзін голас гавораць і начальнік заставы "Казімірава" Вадзім Кісель, і яго намеснік Алег Гулевіч.

Ад шчырага сэрца жадалі мы маладым камандзірам поспехаў...

Выступаючы перад пагранічнікамі і Уладзімір Карызна, і Міхась Пазнякоў, і я пераканаліся, як неабходна, важна сустракацца з імі, несці ім мастацкае слова: такіх удзячных слухачоў толькі можна жадаць.

Завяршаючы гэтыя нататкі з паездкі па Брэстчыне, хочацца дадаць, што пэўнае ўзаемаразуменне мы мелі і з уладнымі структурамі вобласці і горада, калі гаварылі пра пашырэнне падпіскі на нашы беларускія выданні, часопісы. Нішто не заменіць ролю мастацкай літаратуры ў выхаванні чалавека. Бясспрэчная ісціна, але не шкодзіць часам яе паўтараць.

Яўген КАРШУКОЎ

***НА ЗДЫМКУ:** начальнік заставы ст. лейтэнант Мікалай КУЧАРУК са сваім выхаванцам.*

ФОТА М. ПАЗНЯКОВА

Ян ШАДЭК:

"У нас шмат агульнага"

Скандынавы заўсёды былі людзьмі моцнымі, уплывовымі і... сціплымі. Адкрыўшы Амерыку за стагоддзі да Калумба, яны падаравалі лаўры першынства паўднёваму еўрапейцу; былыя тэрыторыі агромністага некалі Шведскага Каралеўства цяпер уваходзяць у склад многіх суседніх дзяржаў. Што яшчэ ядная нашчадкаў ліцвінаў з нашчадкамі вікінгаў? Каб адказаць на гэтае пытанне, я сустрэўся з кіраўніком аддзялення маскоўскага Пасольства Швецыі ў Мінску сп. Янам ШАДЭКАМ.

— Ад Мінска што да Санкт-Пецярбурга, што да Берліна ці Стакгольма — каля 1.000 кіламетраў. На вашу думку як чалавека, які працуе тут ужо некаторы час, Беларусь — гэта сімбіёз заходняй і усходняй культур, ці, у большай ступені, краіна постсавецкая?

— Беларусь — у першую чаргу краіна еўрапейская, як гістарычна, так і геаграфічна. Канечне, вопыт знаходжання ў складзе Савецкага Саюза і 120 гадоў пад рускай уладай дадаюць спецыфічных асаблівасцяў, якіх, да прыкладу, няма ў Швецыі. Аднак ёсць у вашай краіны і больш старажытная, еўрапейская гісторыя. Што важна, ёсць талерантнасць да розных поглядаў, розных рэлігій і культур.

Некалькі гадоў таму я працаваў у Чэшскай Рэспубліцы і на вакацыі ездзіў дадому, у Швецыю, на машыне. У гэтым годзе я здзейсніў першае сваё падарожжа дадому з Мінска, таксама на машыне — атрымалася значна хутчэй, чым з Чэхіі.

На вялікі жаль, Беларусь пакуль не праявіла асаблівага жадання далучыцца да еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў, і мы вельмі хвалюемся, каб з цягам часу яна не засталася па-за аб'яднанай Еўропай.

— Але ўсё ж такі мы далёка ад Швецыі. А чым далей ад дому, тым больш востра адчуваеш патрэбу ў зносінах з суайчыннікамі. Вы былі ініцыятарам стварэння ў Мінску "Клуба аматараў гарохавага супу"... Для чаго ён створаны і як функцыянуе?

— Калі чалавек жыве за мяжой, у іншаземным асяроддзі, час ад часу ўзнікае патрэба абмеркаваць з суайчыннікамі колькі праблем, ад "прыгодаў" у краіне знаходжання да чыста практычных пытанняў: дзе можна смачна паесці, дзе лепшая хімчыстка ці цырульня...

"Клуб аматараў гарохавага супу" — своеасаблівае згуртаванне шведаў на Беларусі. Такія клубы ёсць у Маскве, Празе, і вось цяпер — у Мінску.

"Аматары" сустракаюцца кожны трэці чацвер месяца. Мы збіраемся ў адным мінскім рэстаране, дзе гатуюць добры гарохавы суп і бліны, і абмяркоўваем надзённыя пытанні.

Клуб адкрыты толькі для шведаў, якія жывуць у Мінску. Гэта нашы бізнесмены, выкладчыкі, студэнты, прадстаўнікі міжнародных арганізацый, нарэшце, людзі з нашага офіса.

Чаму гарохавы суп і чаму па чацвяргах? Гэта — даўняя шведская традыцыя, вядомая з часоў вікінгаў. Пятніца была постным днём, і таму трэба было наядацца ў чацвер. А паколькі гарохавы суп падаецца з блінамі, то ўяўляе сабой даволі сытную страву.

Сапраўдны сацыялізм?

— Дні культуры Швецыі ў Беларусі даўно ўжо не "дні": у гэтым годзе іх правядзенне заняло больш як месяц. Цяжка ўзгадаць такі маштаб падобных мерапрыемстваў на Беларусі і такую цікаўнасць беларусаў да культуры еўрапейскай краіны. З чым, на ваш погляд, гэта звязана?

— Маштаб, які вы адзначылі, — ёсць вынік попыту, які мы стараемся задаволіць. Мы бачым, як узрастае ў беларускім грамадстве цікавасць да Швецыі і шведскай культуры, і адказваем мерапрыемствамі. У той жа час, цікавасць шведаў да Беларусі таксама расце...

У гэтым годзе ў рамках нашых дзён культуры Беларусь наведаў Ян Труэль, сусветна знакаміты шведскі рэжысёр, якога крытыкі ставяць у адзін шэраг з Інгмарам Бергманам. Па вяртанні дадому ён распавядзе, праз тыя ж сродкі масавай інфармацыі, пра вашу краіну. Такім чынам у нас складваецца нейкае ўражанне пра Беларусь, бо яна яшчэ недастаткова добра вядомая ў Швецыі. Аддзяленне Пасольства Швецыі ў Мінску наўмысна ўдзяляе столькі ўвагі культурным абменам, стасункам людзей, таму што гэта — зарука узаемнага пазнання.

Што да беларусаў, то, на маю думку, у іх заўсёды была цікаўнасць да нас. Я ведаю, што ў Савецкім Саюзе многія думалі: у Швецыі — сапраўдны сацыялізм, ці не лепшы за савецкі. Гэта, мяркую, невялічкае непаразуменне, але ідэал — ён з тых пор застаўся яшчэ. Тым больш, існуюць паміж намі і больш грунтоўныя гістарычныя сувязі, яшчэ з часоў вікінгаў. Наколькі я разумею, беларусы зараз актыўна цікавяцца гісторыяй і больш пра гэта чытаюць.

Магчыма, шмат маладых людзей у вашай краіне разглядае шведскія універсітэты як варыянт для набыцця адукацыі ці хацелі б працаваць на шведскім прадпрыемстве. Скандынаўскі цэнтр у Мінску адзначае, што шведская мова стала даволі папулярнай на Беларусі — усё больш і больш жадаючых наведвае нашыя курсы.

І, безумоўна, трэба адзначыць яшчэ два важныя чыннікі павелічэння цікавасці: гэта папулярнасць Астрыд Ліндгрэн і... хакея *(смяецца.* **М. А.***)*.

— Можа, гэта выклікана падабенствам менталітэтаў? Ці падобныя мы?

— Мы жывём у рэгіёне Балтыйскага мора, а беларусы, як вядома, маюць не толькі славянскія, але і балцкія карані. Можа, таму нашыя менталітэты больш падобныя, чым, да прыкладу, шведскі і рускі.

Многія шведы мяркуюць, што паміж Беларуссю і Расіяй няма ніякай розніцы. Я некалькі гадоў працаваў у Расіі і магу сказаць, што гэта зусім не так. Я перакананы: існуе істотная розніца паміж рускім і беларускім народамі. Як я ўжо казаў, Беларусь — гэта больш еўрапейская краіна. Тут людзі прыстойныя, больш раўнапраўныя. Як і для шведаў, для беларусаў значна важнейшыя — сацыяльныя пытанні. І ўвогуле — у Беларусі чалавек уяўляе сабой большую каштоўнасць, чым у Расіі. Для Расіі, як мне здаецца, характэрна важнасць калектыву, а на Беларусі цэніцца Асоба.

Дарэчы, абедзвюм нацыям уласцівы цярпімасць, нейтралітэт і спакой: калі б шведы ці беларусы захацелі зрабіць рэвалюцыю, яны б спярша спыталі ў міліцыі *(усміхаецца.* **М.А***)*.

Культура — найважнейшы тавар

— Інгмар Бергман, Астрыд Ліндгрэн, "Roxette", "Ace of Base", "ABBA"... Кажуць, шведы першыя заняліся масавым экспартам культуры. Ці зрабілася культура адным з найважнейшых артыкулаў экспарту Каралеўства?

— Рыхтуючыся да інтэрв'ю, мы спрабавалі высветліць, колькі мільярдаў долараў атрымлівае краіна ад экспарту культуры штогод... На жаль, такой статыстыкі няма. Вядома толькі, што па экспарце музыкі Швецыя на 3-м месцы ў свеце пасля ЗША і Вялікабрытаніі.

Карані нашага поспеху — гэта, без сумневу, "ABBA". Яна не толькі дасягнула сусветнага прызнання, яна была *першай шведскай групай*, што дасягнула сусветнага прызнання. Яе ўдзельнікі — Агнета, Бэні, Б'ёрн і Анні-Фрыда далі моцны штуршок самасвядомасці ўсіх шведаў, прымусіўшы іх паверыць у сябе. Менавіта за гэта шведы помняць, любяць і паважаюць іх дагэтуль. І, канечне ж, "ABBA" каталізавала з'яўленне шматлікіх іншых калектываў і выканаўцаў, якіх зараз ведаюць у любым кутку планеты — хоць і не ўсе ўсведамляюць, што яны шведскія.

Вельмі вялікай папулярнасцю ў свеце карыстаецца шведская культура харчавання. Нашы кухары атрымліваюць прызы і дыпломы на шматлікіх міжнародных конкурсах. Назіраецца новая хваля шведскага фільма; некаторыя маладыя рэжысёры сталі вельмі вядомымі за мяжой.

...Крыніца поспеху — гэта перш-наперш людзі, вельмі таленавітыя і кампетэнтныя. З другога боку, гэта, безумоўна, дзяржаўная падтрымка: дзяржава мае на мэце стварыць шведскім талентам такія ўмовы, такое асяроддзе, каб яны маглі нармальна развівацца. Напрыклад, у любой музычнай школе дзеці могуць узяць інструменты дахаты, і ніхто не будзе браць з іх ці іх бацькоў нейкую плату за гэта.

Эфектыўная эканоміка: справа не ў гігантах

Безумоўна, у грашовым эквіваленце прыбыткі ад экспарту культуры меншыя, чым ад экспарту аўтамабіляў ці мабільных тэлефонаў. Але культура — тавар, бадай што, найважнейшы: з яе дапамогай ствараецца імідж краіны, краіны еўрапейскай і сучаснай. З другога боку, сучасныя пакупнікі, магчыма, не так задумваюцца над тым, адкуль той ці іншы прадукт паходзіць... Напрыклад, я не вельмі ўпэўнены ў тым, што людзі ведаюць, што *"Roxette"* — гэта шведскі гурт.

— Культура толькі на экспарт ідзе ці паспявае задаволіць патрэбы ўнутранага рынку? І як самі шведы ставяцца да такой папулярнасці сваёй культуры за мяжой?

— Напачатку, гадоў трыццаць таму, шведы не зразумелі маштабнасці прарыву, які зрабіла тая ж "ABBA". Аднак сёння мы ведаем, што наша музыка, кіно, тэатр, кухня запатрабаваныя за мяжой, і ганарымся гэтым.

Тым не менш, вельмі часта шведскія выканаўцы больш папулярныя за мяжой, чым на радзіме. Напрыклад, наша спявачка Мэя прыйшла на шведскую культурную прастору з... Японіі. Яшчэ адзін наш спявак практычна невядомы ў Швецыі, але займае першыя месцы хіт-парадаў у Тайландзе.

А ўвогуле, нас толькі 9 мільёнаў, і такі агромністы попыт на культуру маленькага народа — гэта, бясспрэчна, поспех. Бо ёсць шмат невялікіх краін, пра якія мы не так многа ведаем, не бачым ні іх тавараў на рынку, ні іх прадстаўнікоў у сусветнай гісторыі.

— У вас 73 працэнты насельніцтва штодзённа карыстаецца Інтэрнетам. Згодна той жа статыстыцы, у 9-мільённай Швецыі публічныя бібліятэкі штогод аддаюць у карыстанне 65 млн. кніг, з якіх 40 працэнтаў — дзіцячыя. У чым сакрэт таго, што ў Швецыі прагрэс не замяняе, а дапаўняе традыцыі?

— Менавіта я не бачу тут супярэчнасці, якую вы адзначылі. Напэўна, не бачыць яе і большасць шведаў...

Бібліятэкі ў Швецыі — вельмі важная крыніца інфармацыі. Яны не толькі з'яўляюцца "пунктамі па выдачы кніг". У любой публічнай бібліятэцы нашай краіны ёсць абсалютна бясплатны доступ у Інтэрнет, і тыя, у каго няма Інтэрнета дома, карыстаюцца ім у бібліятэках. Гэта было асабліва важна 10— 12 гадоў таму, калі Інтэрнет толькі з'явіўся, быў нечым вельмі новым і не выклікаў ахвоты насельніцтва набываць хатні камп'ютэр і далучацца да новых тэхналогій. Я мяркую, бібліятэкі адыгралі вельмі вялікую ролю ў тым, што Швецыя зараз — лідэр па выкарыстанні камп'ютэраў насельніцтвам.

Шведы чытаюць шмат газет, у якіх па-рознаму асвятляюцца падзеі, па-рознаму выкладзены матэрыял. Гэта дапамагае сфарміраваць свой пункт гледжання, якога мы вельмі прытрымліваемся. Наклад самых буйных газет, такіх, як *Aftonbladet*, перавышае 500.000 асобнікаў. Гэта значыць, што адну толькі газету з такім накладам штодзень чытаюць 1-1,5 мільёна чалавек, г. зн. 10-15 працэнтаў насельніцтва. Калі параўноўваць з лічбамі ў іншых краінах, то, да прыкладу, у самага папулярнага выдання Францыі — *Le Monde* — наклад таксама паўмільёна, але ж французаў не 9, а каля 60-ці мільёнаў!

Папулярнасць газет, кніг, Інтэрнета вынікае з таго, што шведы жадаюць ведаць, што адбываецца як у іхняй краіне, так і за мяжой, у іншых культурах, і ўвогуле прагнуць быць добра інфармаванымі.

— Ва Усходняй Еўропе, і ў Беларусі ў прыватнасці, шмат анекдотаў ходзіць пра шведскія сем'і... Гэта міф ці часткова праўда?

— Вядома, што і ў міфаў ёсць нейкія рэальныя карані *(усміхаецца. — **М.А.**)*. У 60-я, у сувязі з хіпі і вольным жыццём, у Швецыі ці не больш як у любой іншай краіне назіраліся пэўныя тэндэнцыі, здымаліся занадта эратычныя для нораваў тых часоў фільмы...

Зараз жа, на маю думку, няма асаблівай розніцы паміж шведскімі сем'ямі і сем'ямі ў іншых краінах кантыненту, а ўсе тыя міфы, напэўна, з'яўляюцца проста чуткамі. Такі прыклад: некалькі гадоў таму па свеце пайшла навіна, што ў спакойнай Швецыі вельмі вялікая колькасць самазабойцаў. Мы правялі расследаванне, і высветлілася, што чуткі тыя аказаліся звычайнай дэзінфармацыяй, якую распаўсюдзіла нейкая там "аналітычная" кампанія ў Амерыцы.

Канечне, у нас адсутнічаюць многія стэрэатыпы і комплексы, у нас ёсць пэўная свабода ў сям'і, але нельга сказаць, што шведы — нейкія там сексуальныя маньякі ці ненармальныя.

— Напэўна, амерыканцы проста спалохаліся, што Швецыя выйдзе на першае месца па экспарце музыкі, і вырашылі зрабіць паклёп...

— *(Смяецца — **М.А.**)* Так, і гэтага нельга выключаць...

— А ўсё ж такі, Швецыя — ліберальная краіна?

— Адносна. Я мяркую, што ёсць краіны значна больш ліберальныя, такія, як Данія ці Нідэрланды. Там яшчэ больш свабоды і больш прагрэсіўная мараль у праблемах лёгкіх наркотыкаў, прастытуцыі ці эўтаназіі... Ведаеце, гэта пытанне надзвычай філасофскае. Нельга адназначна сказаць, што больш ліберальна і правільна — забараніць прастытуцыю ці дазволіць, як у Нідэрландах...

— Не сакрэт, што шведская мадэль кіравання дзяржавай з'яўляецца ледзь не ідэальнай у вачах многіх беларускіх чыноўнікаў. Пытанне, якое патрабуе не сціплага адказу: чаму ў вас можна павучыцца?

— Я б не праводзіў такіх катэгарычных межаў: маўляў, мы — настаўнікі, вы — вучні. Хутчэй, павінен быць дыялог, пры якім мы б мелі магчымасць падзяліцца часткай свайго досведу; мабыць, ёсць некаторыя дэталі, якія мы хацелі б арганізаваць "па-беларуску".

Асабліва важныя, на наш погляд, — гэта адносіны паміж рынкавай эканомікай і грамадствам. Тут, наколькі я разумею, сацыяльныя праблемы вельмі важныя. На Беларусі ні насельніцтва, ні дзяржаўнае кіраўніцтва не жадалі такіх рэзкіх і балючых зменаў да рынку, што адбыліся цягам апошніх гадоў у іншых краінах Сярэдняй і Усходняй Еўропы. Магчыма, тут людзі часам баяцца, што з прыходам рынку Беларусь ператворыцца ў цалкам алігархічную краіну, якой з'яўляецца, да прыкладу, сучасная Расія. Але баяцца гэтага не трэба. Я мяркую, у Беларусі сёння ёсць шанц паволі пабудаваць такую мадэль, пры якой якасць жыцця будзе залежаць не толькі ад таго, колькі грошай у тваёй кішэні. І мы б вельмі хацелі, каб шведскі вопыт суіснавання рынкавай эканомікі ды істотных сацыяльных гарантый быў апрабаваны на Беларусі.

У нас і ў нашых партнёраў па Еўрасаюзе ўжо маецца з Беларуссю некалькі супольных праектаў: у галіне аховы здароўя, прыродных рэсурсаў... Будуць новыя праекты ў галіне сельскай гаспадаркі. На ўзроўні намеснікаў міністраў праходзіць абмен вопытам паміж чыноўнікамі. Гэта важна, што ўплывовыя людзі Беларусі, людзі, якія прымаюць тут рашэнні, маюць магчымасць вывучыць шведскі вопыт і сказаць, ці жадаюць яны яго імплементацыі на радзіме.

Агульная ж доля шведскай дапамогі Беларусі ў рамках праектаў Еўрасаюза склала на сёння 30 млн. шведскіх крон, ці каля 3,5 млн. еўра.

— На адной з прэс-канферэнцый у лістападзе 2002-га вы заявілі, што, калі ў нашай краіне будзе праяўлена цікавасць да рэформ у галіне малога і сярэдняга бізнесу, Швецыя гатова ўзняць узровень супрацоўніцтва з Беларуссю. Праз год у Мінску адкрылася аддзяленне маскоўскага Пасольства. Што трэба для таго, каб Шведскае Каралеўства заснавала на Беларусі асобную Амбасаду?

— Рэформа малога бізнесу — вельмі важны паказчык "рынкавасці" дзяржавы. Бо не толькі гігантам прамысловасці, такім, якімі багата Беларусь, трэба кіраваць вытворчасцю. Падмурак эфектыўнай эканомікі — гэта малы і сярэдні бізнес.

Можна сказаць, што адкрыццё аддзялення маскоўскага Пасольства — гэта першы крок да, уласна, Амбасады. Насамрэч, рашэнне Шведскага парламента аб адкрыцці Пасольства ў Мінску было прынята больш за год таму. Аднак потым ва ўрада з'явіліся іншыя прыярытэты. Да прыкладу, пашырэнне Еўрапейскага Саюза абавязала нас адкрыць дыпламатычныя прадстаўніцтвы ў Славакіі і на Кіпры; да таго ж, мы адкрылі Генеральнае консульства ў Калінінградзе. Паколькі наш бюджэт абмежаваны, адкрыццё мінскага пасольства трэба было перанесці.

Але працы для шведскіх дыпламатаў у Мінску ўсё больш і больш. Трэба развіваць культурныя сувязі, дапамагаць шведскім прадпрымальнікам, што ладзяць тут бізнес... Мы штогод выдаём беларусам 3,5 тысячы віз. Таму праз год-два я бачу Амбасаду адкрытай.

Гутарыў
Мікалай АНІШЧАНКА

Усё толькі... працягваецца!

Напачатку хачу нясціпла зазначыць, што наўрад ці магчыма разгледзець што б там ні было, больш менш не "раскідаўшы" па сваіх месцах усе чыннікі, якія выклікалі гэту з'яву да жыцця. Тым больш, калі размова ідзе пра постмадэрнізм.

Справа тут вось у чым. Калі зараз мы з лёгкасцю (хай сабе і ўмоўнай) можам "паталагаанатамічна" разгледзець, напрыклад, Рэнесанс, як з'яву , што ўжо адбылася ў мінулым, г. зн. завершаную, акрэсленую, то постмадернізм (у далейшым — **П.**) з'ява, якая распачалася, але яшчэ знаходзіцца ў руху, так бы мовіць, не з'яўляецца нечым цэлым. Адпаведна раскласці яе на часткі амаль немагчыма. Я кажу "амаль" таму, што зараз буду займацца менавіта гэтым. Безумоўна, шматлікія пастулаты "постмадэрністаў пра постмадэрнізм" у далейшым будуць шматкроць аспрэчаны. Таму варта сказаць, што аналізавацца тут у пэўнай ступені будзе тая частка П., што ўжо адбылася.

Безумоўна, усялякая з'ява (культурная, палітычная, сацыяльная) мае сваё прычыннае паходжанне. П. таксама.

Напэўна, адно з самых распаўсюджаных меркаванняў аб з'яўленні П. у цяперашнім выглядзе — вычарпанасць "дапостмадэрновай" літаратуры, быццам усё ўжо напісана.

Вядомыя борхесаўскія "Чатыры цыклы" надта паспрыялі нараджэнню гэтай "тэорыі літаратурнага канца". Я аспрэчу прыхільнікаў дэкадансу самім жа Борхесам: "Упэўненасць, што ўсё ўжо напісана, знішчае нас ці ператварае ў прывідаў" ("Вавілонская бібліятэка "). Але мы ж яшчэ ёсць (наколькі можна быць), а ў сувязі з тым, што маем уласцівасць адкідваць цень, — дакладна не здані. Таму гэткая песімістычнасць, мяркую, не да месца.

А памылка тут схавана, хутчэй за ўсё, у блытаніне паміж прычынай і вынікам.

Тут трэба збочыць і зазначыць, што сам сябе дыскрэдытаваў тым, што заснаваўся на мінулай літаратуры, чым нарадзіў размовы наконт сваёй другаснасці. І калі разглядаць яго адно як вынік "вычарпанасці" класікі, а не звяртацца да прычыны ягонага з'яўлення, то сам факт, і сама ідэя існавання П. спазнае паразу праз адсутнасць сэнсу.

Так заснаваны на класіцы, так як паразіт смокча дармавы сок, у выніку чаго падасца — бегае па коле, з'яўляецца культурай, асуджанай на самагубства, як абсалютна неперспектыўная з'ява. Але тут трэба больш пільна паглядзець, якія стасункі насамрэч існуюць паміж П. ды класікай. І тады бачна, што П. не перапісвае сваю літаратурную папярэдніцу, а ўсяго толькі выкарыстоўвае яе як крыніцу прататыпаў. Але ж і класіка мае свае прататыпы — з жыцця. А П. бярэ гэтыя " прадукты", рыхтуе на сваім стале па новых рэцэптах. І гэтая ягоная асаблівасць — нават больш, чым цудоўна прадуманы ход (калі ўвогуле прадуманы). Гэта проста найлепшы прыклад прадуктыўнасці літаратурнага твора. І вось чаму: П. (у тых выпадках, калі "бярэ" класіку) не прымушае чытача задумвацца над пытаннямі кшталту, чаму горад менавіта N, а галоўны герой — Пеця, а не Вася. Гэта ўсё ўжо даўно абмеркавана-пераабмеркавана, разгледжана з усіх магчымых бакоў. І тым самым "новае мастацтва" дазваляе сканцэнтравацца выключна на той праблеме, якую даносіць аўтар, г.зн. на "голай ідэі", прасачыць думку ад пачатку да канца не адхіляючыся ўбок.

Але што б там ні было — гэта ёсць вынік.

А насамрэч, варта арыентавацца **на прычыны, ці хутчэй мэты, з'яўлення П. як феномена культуры сучаснасці.**

І вось яны, гэтыя прычыны.

Літаратура класічная на працягу шматлікіх стагоддзяў стварала моцны фундамент. На гэтую грандыёзную будоўлю цягнуліся разнастайныя ідэі, светапогляды дый філасофскія перакананні. Яны спрачаліся, адмаўлялі адно аднаго, дадавалі, працягвалі. Эпоха скончылася – трэба рабіць высновы. З гэтай прычыны паўстае П., яму трэба перажаваць аграмоністы "бутэрброд" з неверагоднай колькасцю "інгрэдыентаў". А вызначыць трэба ўжо не склад гэтага "бутэрброда", а тое наколькі ягоныя "кампаненты" да месца на "стале сучаснасці".

Незаўважна з гэтай прычыны вынікае наступнае следства, адрознае ад вышэй апісанага: П. забяспечвае выпраўленне памылак класікі (канечне, праз прызму суб'ектыўнасці), стабіць пад сумнеў тыя, ранейшыя "догмы" і пастулаты. П. пераасэнсоўвае, магчыма, для таго, каб высунуць нейкую абмежаваную колькасць ідэй і накірункаў далейшага развіцця думкі і чалавека.

Як ні нахабна будзе гучаць, але класіка, як ні круці, самадастатковай назвацца не можа. Прынамсі, зараз. Удакладню. Несамадастатковай з'яўляецца хутчэй не класіка, а існаванне класікі. Класіка патрабуе П-му. Бо калі б не было неабходнасці ў ягоным існаванні — УСЁ б завершылася. Літаральна УСЁ. Канечне, спярша літаратура, ужо створаная, некаторы час падтрымлівала б існаванне быцця, але гэта наўрад ці цягнулася б бясконца. Прывяду некалькі метафар.

Літаратура — гэта рака, яна заўсёды павінна быць у руху, калі не — ператворыцца ў сажалку, зарасце, высахне, знікне. Услед за ёю змарнее ўся навакольная флора і фаўна.

Метафара другая падкрэсліць бясспрэчную неабходнасць існавання П.

Літаратура — віно. Якое з цягам часу рызыкуе ператварыцца ў воцат. І калі акрамя гэтага "віна" не будзе існаваць нечага іншага, што яшчэ не мае вялікага тэрміну вытрымкі і ў воцат у бліжэйшы час дакладна не ператворыцца, ёсць небяспека загінуць з прычыны смагі. Розныя метафары, абедзве "мокрыя". Не выключаюць. Але дапаўняюць адна адну.

З нагоды крытыкавання ў пэўнай ступені П-мам класікі ён забяспечвае ёй існаванне ў нашай рэальнасці, працягвае яе існаванне, не дае патануць у Леце (у тым, што далёка не ўсё перадасца нашчадкам, няма ніякага сумневу: досвед назапашваецца значна хутчэй, чым эвалюцыянуе чалавек (калі гэты працэс ідзе, у чым менавіта я вельмі сумняваюся), мозг, памяць папросту не здольныя змясціць усяго, чаго дамагаецца чалавек). П. працягвае жыццё класіцы ўжо наяўнасцю самога сябе. Працягвае тым, што для разумення сябе літаральна прымушае чытаць, ведаць класіку.

І яшчэ. П. як бы асучаснівае яе. Безумоўна, "вечныя" маральныя канстанты пераважна не чапляюцца. Але "тая" літаратура досыць далёка ад нас і рызыкуе ўспрымацца (хай не зараз, але цалкам верагодна — пасля) як архаізм, рарытэт, у нейкай ступені адарваны ад "камунікацыйнага грамадства". П. атаясамляе час мінулы з часам сучасным, чым можа нясціпла назвацца "зменнай класікай", ці дакладней — формай класікі. Мог бы назвацца, калі б не колькі там спецыфічных характарыстык.

П. па сваёй сутнасці рэч досыць агрэсіўная, нястрымная. Мэтай сваёй ставіць найперш зруйнаванне. Але выключна ў тым сэнсе, што стварэнне новага — гэта ў пэўным сэнсе заўсёды зруйнаванне старога.

Але гэтая з'ява зусім не страшная і пагрозлівая, бо ў далейшым, постмадэрновым, будаўніцтве выкарыстоўваецца ўсё тая ж "класічная" цэгла.

З вышэйсказанага можа вынікнуць, што П. — гэта і не мастацтва ўвогуле, а ягоны інструмент. Мастацтва, літаратура прыйдуць пасля яго. Гэта такі прамежкавы стан, стан пераасэнсавання, выбару шляху. Адпачынак: ужыванне ўжо створанага. Ці проста падрыхтоўка да "нечага іншага", што прыйдзе пасля.

Гэта так і не так адначасова.

П. — гэта мастацтва, толькі з іншымі, нязвыклымі, рысамі.

Безумоўна, П. існуе найперш у цяперашнім часе, але працуе на будучае праз мінулае, працуе ў сферы мастацтва, мае форму і змест.

Ён — безумоўна мастацтва, прычым мастацтва з новай філасофіяй. Філасофіяй формы, якая бясспрэчна дамінуе, ці хутчэй дамінуе яе складанасць.

Менавіта мудрагелістасць "вопраткі" ў сувязі з тым, што П. не працуе на стварэнне **істотна** новага ў змесце, высоўваецца на першы план. Нават сягае ў сферу сюррэальнага, не грэбуе, так бы мовіць," гульнёй аднаго мозгу", у сувязі з чым вельмі ўскладняе ўспрыманне самога сябе. П. згубіў каштоўнасць зграбна-зразумелай формы, кінуўшы яе ў прастору "адзінкавых асацыяцый і вобразаў", якія наўрад ці супадуць у двух людзей.

Такое вось немастацкае мастацтва атрымоўваецца — мастацтва-інструмент.

П. — з'ява авангардная. Першая прычына (незразумеласць) узгадваецца ў папярэднім абзацы. Другая — больш костная, цяжка рухомая, бо палягае цалкам у сферы чалавечага жадання/нежадання зменаў. Але, на жаль, сфера гэтая часцей схільная ў бок "нежадання" і маладынамічная, таму нярэдка выступае ў ролі тормазу новага.

А справа тут вось у чым.

Класіка, папросту, **прывычней**, як, скажам, свая зубная шчотка. У кантэксце дадзенага параўнання П. — напрыклад, шчотка для адзення. Па сутнасці ёй таксама можна зубы пачысціць, але гэта настолькі нязвыкла, што наўрад ці хтосьці будзе гэтым займацца, хаця ў аснове рэчы гэтыя аднаго кшталту.

Дзякуючы гэтаму прыкладу пакрысе пераходжу да перформансу, як, бадай, самага яскравага складніка П. Ён (перформанс) настолькі непадзельны з П., што часам атаясамляецца з ім, ці нават замяняе. У сувязі з тым, што П. яшчэ толькі набірае сваю моц, ён імкнецца да свайго канчатковага фарміравання (напэўна, добра не ўяўляючы, якім яно мусіць быць). Знаходзіцца ў стане пастаяннага пошуку, кідаецца з боку ў бок. Карацей кажучы, характар у П. дынамічны, а перформанс забяспечвае яго новымі, не састарэлымі, сродкамі дасягнення сваіх "бунтарскіх" мэтаў.

Гэта яшчэ раз абвяргае "ідэю другаснасці". Я хачу падкрэсліць: П. — гэта не новае **на старым**, а новае ў **сувязі са** старым.

Апошняе ўвогуле з'яўляецца бясспрэчным. Усё, літаральна ўсё: і мастацтва, і гісторыя, і само чалавецтва — гэта ланцуг, у якім кожны элемент з'яўляецца неабходным для ўсіх астатніх і чыё раптоўнае (ці не раптоўнае) знікненне можа разваліць увесь ланцуг. У дадзеным кантэксце размаўляць пра другаснасць папросту не мае сэнсу.

П. як частка агульнай непадзельнай плыні развіцця падзей падкрэслівае самім сабою яднанне мінулага з сучасным і, адпаведна, мінулага з будучым. Можна тут запярэчыць і сказаць, што гэта ёсць таптанне на месцы. Зусім не. Таптанне на месцы пачнецца тады, калі будучае фактычна перастане існаваць. А яно ўжо па сутнасці існуе, бо незаўважна для самога сябе паўстае "пасля — постмадэрновае". Хаця б гэтае эсэ, якое заснавана ўжо ўласна на самім П. (дакладней, на той яго частцы, якая паспела адбыцца). Такім чынам П. забяспечыў будучыню самому сабе, стварыў пакуль ілюзорнае "пасля".

Мушу вярнуцца да ўзгаданай ужо агрэсіўнасці П. і крыху раскрыць гэтую тэму.

Для Беларусі гэтая характарыстыка мае выключнае значэнне. Безумоўна, справа тут палягае ў далёкім мінулым. Тое, што Беларусь бясконца "цягалі" ў свае дзяржавы, робячы яе часткай іх, не магло не адбіцца на літаратуры. А ў сувязі з тым, што яна ў Беларусі маладая, а народ ніколі не быў надта жадзён да яе, то чужародныя культуры й літаратуры з лёгкасцю клаліся плазамі. Раней гвалтоўна, а зараз (прынамсі, са з'яўленнем Інтэрнета) і добраахвотна. Атрымалася вельмі непрыемная рэч (я змякчыла выраз) — беларускае, сваё задыхаецца пад тоўшчай "іншародных глебаў".



Патрэбен выбух, вялікі, агромністы, моцны, які б здолеў прарваць гэты плаз. Справа цяжкая, але магчымая. Улічваючы перформаснасць, можна меркаваць, што П. наўрад ці пакіне кагосьці абыякавым, так ці інакш рэакцыя будзе і будзе рэакцыяй на беларускае. Не на расійскае, не на амерыканскае, а на сваё. А гэта ўжо добра.

Цяпер мушу адказаць, як П. глядзіць на свет. ПРАГРЭСІЎНА. І ніяк інакш. А гэтая прагрэсіўнасць вынікае менавіта з таго, што арыентуецца ён цалкам на будучае, працуе на яго. Бо калі б П. быў з крызісным светаадчуваннем, то мусіў бы адмовіць старую літаратуру, а ён вельмі добра з ёй ужываецца.

Але ж галоўным застаецца ўсё ж мэта ягонага існавання.

П. не ёсць як ёсць. Ён — яшчэ толькі пачатак самога сябе. Гэтым самым П. забяспечвае працяг самога сябе, а значыць літаратуры, мастацтва ўвогуле.

Чаму ён з'явіўся менавіта цяпер? Уласна я маю некалькі версій: па-першае, прыспеў час пераменаў, па-другое, мастацтва, літаратура запатрабавалі развіцця ў кантэксце сусветнай культуры і, па-трэцяе, — паўстала тое пакаленне NEXT, якое альтэрнатыўна мысліць і мае цэлы мех новых, некранутых ідэй і гатовае падзяліцца імі з астатнім людам.

І напрыканцы яшчэ некалькі слоў. Магчыма, усё выглядае не так аптымістычна, як я паспрабавала падаць. Але вельмі не хочацца, каб усё скончылася менавіта на мне. Проста неяк непрыемна робіцца ад думкі, што ўжо тупік і адзіны накірунак — назад.

Занадта няўтульна, калі ўзгадваю словы Ніцшэ:" Блізіцца час, калі чалавек ужо не зможа нарадзіць ніводнай зоркі". І тым больш прыкра, калі думаю, што ён мае рацыю.

Ганна КАВАЛЁВА

КАБ ЖЫЛА гістарычная памяць

Не так даўно, гартаючы перыёдыку, што сабралася за час хваробы, выпадкова зачапіўся за інтэрв'ю маладога кінадакументаліста Віктара Аслюка. Уважліва прачытаў, парадаваўся. Парадаваўся за такую простую і шчырую любоў да роднай зямлі і яе людзей, за глыбокае разуменне прыроды і сутнасці мастацтва ("А трэба зразумець, што цэнтр зямлі і ўсяго Сусвету — там, дзе твой дом. І здымаць тое, што цікава табе, так, як адчуваеш ты, і заставацца пры гэтым максімальна шчырым". Далей: "А я лічу, што на ўсе падзеі свету мы павінны глядзець са свайго кутка, з інтарэсаў сваёй зямлі".), парадаваўся за арганічнае адчуванне і ўсведамленне асабістай далучанасці да гісторыі роднага краю, за трапяткое пакланенне мінуўшчыне — самай блізкай, асабістай як бы. Ён сцвярджае: "Самае лепшае, што ў нас ёсць, — гэта наша гісторыя. І нацыя наша складаецца не толькі з тых людзей, што жывуць побач, але і з тых, што былі да нас, — у нас усё на іх могілках пабудавана і мы па іх праху ходзім".

Думкі асабліва цікавыя як выяўленне адной з найгалоўных тэндэнцый духоўнага жыцця нацыі. Тэндэнцыі, якая шмат у чым вызначае змест і характар развіцця сённяшняга мастацтва, можа, найперш літаратуры. Маецца на ўвазе выключная ўвага да матэрыялу (падзей, фактаў, асобаў) гісторыі, да праблематыкі нацыянальна-гістарычнай. Асабліва бачыцца і выяўляецца гэта ў творчасці сучасных 50-гадовых, 40-гадовых, а таксама за іх маладзейшых.

Чаму так?

Папярэднія пісьменніцкія пакаленні мелі за рэальную аснову творчасці і асабістага духоўнага фарміравання вёску. Вёска была крыніцай нацыянальнай мовы, псіхалогіі, побыту, нацыянальнага духу. Са знікненнем традыцыйнай вёскі знікае рэальная жыццёвая аснова нацыянальнага бытавання народу. Горад жа заўсёды быў у значнай меры касмапалітычным. А сучасны наш горад, па сутнасці, пазбаўлены нацыянальнага аблічча. Ёсць дзяржава, народ без пэўна выяўленай нацыянальнай ідэнтычнасці. У такіх умовах асноўнай, калі не адзінай, крыніцай нацыянальнага сілкавання, а тым самым і ўратавання, становіцца гісторыя.

Гады перабудовы, пачатак нацыянальнага адраджэння, сённяшняя духоўна-палітычная сітуацыя як найлепш спрыялі і спрыяюць з'яўленню гістарычнай мастацкай літаратуры. І калі напачатку гэта была патрэба нацыянальнай ідэнтыфікацыі, патрэба нацыянальнага самаўсведамлення, усведамлення сваёй далучанасці да гісторыі, то сёння — у большай ступені імкненне (магчыма, нават на ўзроўні інтуітыўным) у мінулым знайсці як мага больш гістарычных апор для пераадолення, адмаўлення сучаснага зманкуртаванага светаадчування, жаданне, як бы генетычнае, адчуць глыбінную нацыянальную каранёвую сістэму. Галоўнае нацыянальнае сілкаванне, якое раней ішло ад зямлі, ад вёскі, ад прыроды роднага краю, сёння парушана і парушаецца яшчэ больш. І літаратура, для якой лёс народа і лёс нацыі з'яўляецца асновай і мэтай творчасці, шукае, імкнецца адкрываць новыя крыніцы нацыянальнай жыццёвай энергіі. Працэс гэты надзвычай шырокі і выключна актыўны. Відаць, як ніколі ў гісторыі. Бо і пагроза для нацыянальнага існавання страшэнная. На сённяшні дзень гістарычная тэма па сваёй значнасці, па мастацкіх выніках і духоўных набытках, па грамадска-літаратурным рэзанансе, па ўдзеле ў яе распрацоўцы пісьменнікаў розных пакаленняў і розных творчых манер бачыцца як самая значная. Для тых жа, хто прыйшоў у свет у 50-я і пазнейшыя гады і хто творча актыўна раскрыўся ў канцы стагоддзя, зварот да гісторыі, уключэнне гісторыі ў сваю творчасць становіцца жыццёва неабходным для нацыянальнага мастакоўскага самаадчування і самасцвярджэння. Якраз зварот да гісторыі, актыўнае выкарыстанне ўсё яшчэ новага для нашага чытача, гістарычнага матэрыялу надалі іхнім творам сапраўднае сучаснае гучанне, забяспечылі іх нацыянальны аптымізм, вызначылі сённяшнюю духоўную запатрабаванасць.

У сучаснай нацыянальнай гісторыка-літаратурнай мастацкай плыні выразна вылучаецца і творчасць Анатоля Бутэвіча, асабліва ягоная нарысістыка. Спачатку нарысы друкаваліся ў газеце "Звязда". Выклікалі цікавасць шматлікіх чытачоў. Пазней у выдавецкім таварыстве з абмежаванай адказнасцю "Кавалер Паблішэрс" з'явіліся кнігі: "У гасцях у вечнасці" (2001), "Званы Нямігі" (2002), "За наміткай гісторыі" (2003). Яны выдатна афармлены мастаком Паўлам Татарнікавым. Прызначаны для чытача малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Выдаюцца ў серыі "Сем цудаў Беларусі". У кожнай кнізе расказваецца пра сем "цудаў" беларускай гісторыі, нашага мінулага. "Цуды" гэтыя рознага характару, рознага зместу, рознай сацыяльна-гістарычнай значнасці. Вось, напрыклад, змест першай кнігі: "Каложская царква", "Бярэсце", "Крэмневыя шахты", "Крэўскі замак", "Мір — цыганская сталіца", "Музей валуноў", "Мора Герадота".

Кожная кніга пачынаецца ўсхваляваным, прачулым зваротам да чытача, зваротам, які не можа не закрануць ягонае сэрца, не прымусіць пацягнуцца ўсёй істотай да гэтай кнігі.

"Ты — нашчадак даўніх і значных падзей, што ва ўсе часы адбываліся ў нашым краі. Краі, які быў шматкроць уталентаваны многімі выбітнымі постацямі, уганараваны шматлікімі адметнымі з'явамі. Беларуская зямля, як руплівая зберагальніца неацэнных гістарычных і культурных багаццяў, важкіх набыткаў мінуўшчыны, чаго толькі не трымае на сваіх далонях!

Магутныя крэпасці. Стромкія вежы. Спічастыя замкі. Архітэктурна-вытанчаныя храмы і цэрквы. Утульныя сядзібы. Летапісныя гарады і навачасныя паселішчы..."

Пра ўсё гэта расказвае Анатоль Бутэвіч дапытліваму і нераўнадушнаму чытачу. Расказвае па-свойму, вырашаючы свае мэты. Для яго важна не проста пазнаёміць чытача з той ці іншай гістарычнай з'явай, падзеяй, паказаць тую або іншую падзею саму па сабе. Галоўнае — узнавіць усё ў гістарычным кантэксце, з акрэсленнем наступстваў і вынікаў. Больш за тое, паспрабаваць убачыць у гэтых падзеях, з'явах, фактах, гісторыях выяўленне самых высокіх духоўных памкненняў народа, насельнікаў беларускай зямлі. Так, пішучы пра Бярэсце, аўтар згадвае важныя і значныя падзеі, звязаныя з гэтым горадам. "У 1553 годзе берасцейскі стараста, віленскі ваявода і літоўскі канцлер, нясвіжскі князь Мікалай Радзівіл Чорны заснаваў тут першую на Беларусі друкарню, з якой пайшла ў свет знакамітая і вельмі рэдкая цяпер Брэсцкая Біблія". "У канцы XVI стагоддзя ў горадзе ўзнікла праваслаўная брацкая школа, у якой настаўнікам быў вядомы беларускі асветнік Лаўрэнцій Зізаній. У XVII стагоддзі ў езуіцкім калегіуме вучыўся, а пасля быў памочнікам рэктара беларускі мысліцель Казімір Лышчынскі... А берасцейская сінагога лічылася самай старажытнай і першай у Еўропе".

І так усюды. За з'явай, фактам — шырокі гістарычны кантэкст. Аўтару важна падкрэсліць іх гістарычны змест, іх значэнне для беларускай гісторыі, яе насельнікаў, разам з тым выпучыць тое, што робіць іх менавіта беларускімі, прыналежнымі нашай гісторыі.

Крэмневыя шахты: "Без усялякіх перабольшанняў можна сцвярджаць, што старажытныя крэмнездабыўчыя шахты на беларускай зямлі — унікальнае сведчанне майстравітасці, кемнасці і здатнасці нашых далёкіх прашчураў. Гэта каштоўныя крыніцы даследавання прафесійных заняткаў першанасельнікаў беларускай зямлі".

Гісторыя пра Нямігу завяршаецца такімі вось узнёсла-паэтычнымі словамі: "Аднак жа званы Нямігі і сёння поклічным рэхам адгукаюцца ў сэрцы кожнага неабыякавага чалавека, абуджаюць яго святое пачуццё павагі і замілаванасці да роднай зямлі, пачуццё, узгадаванае і выпеставанае нашай пакручастай гісторыяй, нашымі таленавітымі, апантанымі і жыццелюбівымі продкамі".

А гэта пра славутую Каложскую царкву: "Калі над васільковай Беларуссю раннім досвіткам прахопліваецца клапатлівае сонейка, яно ў любую пару года найперш кідае свой ласкавы погляд на Каложу. Дзіўным жыватворным ззяннем успыхваюць яе каляровыя камяні ў сценах, абярэжнай і жыццедайнай сілай свецяцца яе крыжы. І тады здаецца, што гэты шэдэўр беларускага дойлідства, які горда ўзвышаецца на магутных далонях бацькі-Нёмана, не толькі сам поўніцца і прамяніцца велічу і годнасцю, але насычае ёю душы вернікаў, любасцю і дабрынёй гоіць душэўны неспакой, узвялічвае справы і дзеі людзей Белай Русі".

Такі прынцып падачы гістарычных фактаў, такі характар іх асвятлення пануе ва ўсіх нарысах. А фактычная аснова нарысаў вельмі багатая і разнастайная. Кожную гістарычную з'яву, асобу, кожную падзею, пакладзеную ў аснову таго ці іншага нарыса, аўтар імкнецца як мага больш насыціць гістарычным зместам, паказаць у гістарычным руха. Таму кнігі даюць досыць выразнае адчуванне гістарычнага жыцця і гістарычнага руху беларускай зямлі і беларускага народа — руху складанага, супярэчлівага, драматычнага, але слаўнага і годнага. Так з гісторыяй Крэўскага замка "цесна знітаваны лёс Вялікага Княства Літоўскага. У XIV—XVII стагоддзях ён быў рэзідэнцыяй вялікіх князёў Гедымінавічаў". У Крэўскім замку 14 жніўня 1385 года была заключана Крэўская унія — саюз Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства. У гісторыі пра Жыровіцкі абраз Божай Маці ўзгадваецца таксама і Жыровіцкі манастыр, у бібліятэцы якога "ў канцы XVIII стагоддзя захоўвалася 537 рукапісных кніг", гаворыцца пра тое, што ў часы, калі манастыром валодалі уніяты, ігуменам у ім быў Ясафат Кунцэвіч. "Жыровіцкі манастыр вядомы і тым, што ў ім у свой час існавалі Літоўская духоўная семінарыя, Жыровіцкае духоўнае вучылішча. Зараз тут адноўлена Мінская духоўная семінарыя".

У аповедзе пра Кітабы згадваецца гісторыя з'яўлення татар на беларускіх землях, звязваецца яна з часам княжання Гедыміна. Асабліва спрыяў ім Вітаўт Вялікі. Ён "запачаткаваў татарскія пасяленні на беларускіх землях, ухваляў і падтрымліваў іхняе перасяленне", "надзяляў татар ільготамі і прывілеямі", "вызваліў ад падаткаў, спрыяў незалежнасці рэлігійнага жыцця". Яны адказвалі князю ўзаемнасцю. Ваявалі, аралі зямлю, гандлявалі, займаліся рамесніцтвам. Паміж імі і мясцовымі людзьмі "ад самага пачатку ўзнікла... прыязнасць і ўзаемаразуменне, згода і талерантнасць".

А. Бутэвіч насычае нарысы фактамі цікавымі, значнымі, найперш сваёй духоўнай насычанасцю. А гэта тое, што ў найбольшай ступені лучыць даўніну з сучаснасцю, што складае духоўную аснову нашага сённяшняга светаразумення і светапачування. У аўтары арганічна спалучаецца ўвага да фактаў, падзей, уласцівая гісторыку, і здольнасць падаць іх ярка, эмацыянальна, выявіць іх сучасны змест і сэнс. Ён пераканаўча даводзіць, што гісторыя — гэта не толькі мінулае, няхай сабе і вартае памяці і славы. Кожны народ валодае тымі матэрыяльнымі і духоўнымі скарбамі, якія ён стварыў і збярог. У гэтым сэнсе мы жывём у гісторыі пастаянна. Галоўнае — кожнаму ўсведамляць сваю кроўную сувязь з айчыннай гісторыяй, глыбока ведаць і цаніць набытае тымі, хто жыў на беларускай зямлі. У кнігах Анатоля Бутэвіча гісторыя жыве сучаснасцю, звернута да сучаснасці, працуе на будучыню.

Кнігі "У гасцях у вечнасці" і "Званы Нямігі" вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Яны яе вартыя.

Серафім АНДРАЮК

Біблія і літаратура

Гэтая кампактная кніжка, якая ўключае ў сябе цыкл лекцый, прачытаных вядомым і злачынна забітым протаіерэем Аляксандрам Менем, пабачыла свет у Маскве паўтара гады таму і сёння з'яўляецца рарытэтам, нягледзячы на свой значны наклад у 10000 асобнікаў. Праўда, гэты тыраж разышоўся па ўсім абсягу былога Саюза. Тэксты лекцый разлічаныя на адносна інтэлектуальную аўдыторыю.

У кніжцы сем раздзелаў: **Біблія** і

— *апокрыфы старажытнасці і сярэднявечча;*

— *старажытнаруская літаратура;*

— *літаратура XVII стагоддзя;*

— *руская літаратура XVIII стагоддзя;*

— *руская літаратура XIX стагоддзя (дзве гутаркі);*

— *заходняя літаратура XIX стагоддзя;*

— *літаратура XX стагоддзя (тры гутаркі).*

І хоць на зачыне першай гутаркі прот. Аляксандр Мень сціпла папярэджвае, што цыкл яго лекцый — гэта ўсяго толькі сціслы агляд таго, *"як пераламлялася Біблія ў творчасці паэтаў, пісьменнікаў, раманістаў, невядомых, вялікіх і знакамітых"*, але насамрэч закранае даволі глыбокія пласты і творчасці, тэалогіі і літаратуразнаўства...

Прачытаць гэтыя лекцыі для сучаснага (асабліва пачынаючага) літаратара — справа неабходная, бо вяліказначных спасылак на Бога ў цяперашніх аўтараў процьма, тады як самі гэтыя аўтары ёсць толькі дробнай Боскай спасылкай на Сваё чалавекатварэнне ў вечнасці...

"У апакрыфічных кнігах Старога Запавета празмерная напруга эсхаталогіі, неаспрэчнае чаканне канца свету! Гэта быў час, калі свет, падобна да сённяшніх дзён, чакаў сусветнай катастрофы, меркаваў, што гісторыя канчаецца, што яе плынь спыняецца. І ўзнікаюць цэлыя паэмы: "Узнясенне Майсея", "Апакаліпсіс Варуха", "Кніга Адама і Евы", — усе яны гавораць пра тое, што чалавек аказаўся абсалютна непрыгодным Божым тварэннем і хутка ўсё закончыцца, разбурыцца і пераможа толькі праўда Божая... І сапраўды, набліжалася з'яўленне Хрыста! Але яны ўяўлялі гэта сабе ў форме нейкіх грозных катаклізмаў. І ўся гэтая апакаліптычная літаратура хвалявала народ, выклікала ў ім чаканне прыходу страшных дзён канца. Але адбылося зусім іншае: з'явіўся Госпад, не скаланаючы неба і зямлю, а прыйшоў, як і прадказвалі прарокі, "не маючы ні віда, ні велічы", — гаварыў прот. Аляксандр Мень.

І ці не блізкая да вышэй згаданай сітуацыя ў сучасным свеце?!

Ці можам і мы спадзявацца на лепшае, чакаючы горшага? Ці не могуць зрабіцца працягам Біблії найлепшыя мастацкія творы сучаснай літаратуры праз пэўны перыяд зямнога часу?..

Над усімі гэтымі пытаннямі можна паразважаць разам з аўтарам, няспешна і ўдумліва чытаючы гэтую кніжку.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Святлана СІТНІК

Дазвольце прапанаваць вам некалькі сваіх вершаў.
Па спецыяльнасці я педагог-псіхолаг, зараз выхоўваю дачку. Вольны час аддаю філасофіі, вывучэнню беларускай мовы і літаратуры, а таксама творчасці.

Яго нараджэнне

Казаў Паэт: "Дарую Табе песні –
Малітвамі назвалі песні людзі
І да нябёс Тваё імя узнеслі.
Няхай бязмежнай Твая слава будзе!"

Казаў Мастак: "Прынёс я палатно.
То – Твой партрэт у першых промнях сонца.
Іконай стала для людзей яно –
Ты будзеш жыць у душах іх бясконца!"

Казала Маці: "Ад мяне прымі
Пяшчотнае і любячае сэрца.
Сваю любоў падзеліш між людзьмі –
Мая з Табою побач застанецца!"

Дасканаласць

Здавалася, у кветках лугавых
Я дасканаласць формы адшукала.
Няма нічога прыгажэй за іх –
Лічыла я.
А потым – пакахала.

Твой твар, бы лік, у промнях залатых
Як сімвал прыгажосці, малявала.
Не заўважала грубых рыс тваіх –
Маё каханне дасканалым стала.

Жыццё ж мне неспадзеў прапанавала
Адказ на маё простае пытанне.
Там прыгажосць бывае дасканалай,
Дзе злагада пануе ў роднай хаце,
І промень падае падчас світання,
На сонны тварык любага дзіцяці.

Ціша

Ноч цёплай коўдрай туманоў
Палі і рэчку накрывае
І з пахам кветак удыхае
Салодкі водар дзіўных сноў.

Глухі, далёкі гул званоў
Спакой вясковы парушае,
Ды хутка вецер заціхае
І цішыня пануе зноў...

У гэты час усе трывогі
Ляцяць у бездань небыцця.
А ў хаце, што каля дарогі,
Жанчына немаўля калыша.
...Засне глыбокім сном дзіця,
І зноў пануе лад і ціша...

Мікола ПАПЕКА

* * *

Не цябе купіць –
Купіць ноч
Яшчэ дзень прыхапіць з табой...
Вечнасць спіць
Спіць віна
Спіць яна...
Гэтыя пышныя ягадзіцы
І грудзі яе – калыхаюцца...
Калыхаецца зялёны вецер лесу...
І валасы яе...
Не стае моцы падысці
Упасці ў ногі...
Прапасці...

* * *

Ару зямлю:
Выворваю шчарбаты талер...
Не паспяваю спыніцца –
Конь ідзе далей...
Знаходка прыгортваецца.
Ару зямлю:
Вывальваецца марскі вожык,
Мільёнагадовая акамянеласць...
Няма часу спыніцца
Іду далей...
Іду па лесе,
Шукаю грыбоў.
Ведаю, добра ведаю,
На дубах ды бярозах залатое лісце,
Ды няма як падняць галаву...
Упіўся вачамі ў зямлю...
Даглядаю пчаліну ў вуллі
І няма калі паглядзець,
З якіх красак прынесены мёд.

Нараджэнне паэзіі

Прыгожы Персей
Не мае моцы адкрыта
Стрымаць позірк
Медузы-Гаргоны,
Праўды-жыцця...
Першатворчасці вобраз.
У люстэрка зазіраючы,
Адсякае ёй галаву.
Галава, што канае,
Апошнім позіркам убачыла:
З цела яе абезгалоўленага
Вырваўся на волю
Конь крылаты – Пегас.

Збан

Святло ўвасобілася ува мне
Святой часцінкаю бацькоў.
Бы сценкамі збанка,
З вялікім светам
Я мяжую.
Як толькі я закрыю векі –
Цемры збан рассыплецца –
Рассыплецца і свет.

* * *

На паліцах стаяць
Кнігі.
Нікім не чытаная,
Нікім не гартаная
Мудрасць –
Мною пасаджанае дрэва
Ссечана на паперу.

* * *

Па лясной дарозе ночы...
Спявалі мне салаўі,
Поўня свяціла,
Ішлі зоркі за мною...
Па лясной дарозе ночы.

Малюнак Ул. ЛУКШЫ

Канструкцыя паламанага кола

Смоўж з ракаўкай на спіне
Паўзе па гумовым коле
Над ім, як і нада мною, – хмары
Лістоў вінаграду.
Галінка ружовага бэзу ў слоіку.
Стаптаны паэт
Мікола Купрэеў ляжыць
На пчаліных падушках..
...у краіне паэтаў ягоныя мроі-сны.
Валяецца парожняя пляшка.
Дзве п'яныя кульбы,
Томік Хлебнікава...
З вуліцы Леніна падбягае сабака Бомжык
Ды аблізвае яму твар.
Правінцыйны паэт прачыняе
Мутныя вочы, як у жабы,
Просіць:"Мікола,пазвані Галубовічу..."
Выношу з хаты камп'ютэр з мадэмам...
Размаўляе...
Захацеў, каб падвёз яго да чыгункі, ехаць у Мінск...
Нібыта рыкша, вязу яго, як самага багатага чалавека,
На двухколавым возіку... у незваротны шлях...

* * *

Смерць –
месца дзе мяне ніхто не чакае
змрок у якім я адсутнічаю
цішыня у якой мяне няма –
Смерць...

Дзедавы пчолы

Апавяданне

Іван КАНАНОВІЧ

Шурык Карончык, як яго ў вёсцы ўсе ласкава называюць, немаладога веку мужчына летам калоў на падворку дровы і не заўважаў вакол сябе нічога і нікога. Нават не звярнуў увагі на чорна-рудую хмару, прынесеную парывістым ветрам аднекуль здаля, з якой пырснулі першыя кроплі дажджу. Схамянуўся толькі ад навальніцы — суцэльнага вадападу, за якім нябачна стала суседавай хаты, дзе некалі жыў дзед Сцяпан — дабрачы, шчыры чалавек і спагадлівы да дзяцей і дарослых. Ён вечна з рання да вечара ўвіхаўся каля вулляў у пчалярскай масцы. Колькі было ў яго тых вулляў ні ён, Шурык, дый ніхто з вяскоўцаў не лічыў. Дзед заўсёды шчодра частаваў вяскоўцаў. Як выгане мёд, падзываў Шурыка і кожнага разу казаў: «Заімчы, унуча, людзям мёду, і перадай ад мяне ласку — каб іх ніколі пчолы не джалілі». І ён ахвотна разносіў дзедаў мёд па хатах.

Мёд пчолы бралі з высокай разгалістай, у два абхваты, ліпы, якая спрадвеку расла пры дзедавай хаце, пасаджаная некалі яго продкамі. Пад ліпай у летнію спёку ён, Шурык, разам са сваімі аднагодкамі часта бавіў час у цяньку, чакаючы дзедавага пачастунку. Яго доўга чакаць не даводзілася. Сцяпан неўзабаве выносіў ім у місцы кавалкі сотавага мёду, і яны частаваліся колькі каму хацелася, раз-пораз бегаючы да калодзезя праганяць вадой шчымлівую ў горле слодыч...

Так было кожнае лета пакуль жыў-быў дзед Сцяпан. Добра было і дзецям і дарослым, ён нікому не шкадаваў мёду і платы не браў. Летась не стала дзеда. Неяк сумна і няўтульна зрабілася ў вёсцы, асабліва яму, Шурыку. На пасеку знайшоўся гаспадар — далёкі, дзесятая вада на кісялі, дзедаў сваяк з суседняй вёскі, негаваркі адасоблены ад людзей і, як пасля высветлілася Шурыку, надта скупы і зайздросны. Завуць яго Ігнась. Так ён назваўся пры іх першым знаёмстве.

Прыехаў ён сюды неўзабаве пасля дзедавага пахавання, паглядзеў пчол, зайшоў да Шурыка, пачаў гаворку:

— Ты, суседзе, будзь ласкаў, прыглядай за пасекай — а то цяпер зладзеяў столькі...

— А якая будзе плата? — жартоўна спытаў той.

— Мёдам разлічымся ці грашыма, — запэўніў пчаляр.

— Трэба дык трэба, — пагадзіўся Шурык, аглядаючы з ног да галавы незнаёмца, як бы спрабуючы зазірнуць яму ў душу і пераканацца што гэта за птушка.

Пагадзіўшыся на пасаду вартаўніка, ён кожнае ночы прахаджваўся каля былога дзедавага пляца, ахоўваючы пасеку новага пчаляра. Некалькі разоў адгняў ад вулляў гарадскіх падлеткаў-шалапаеў, якіх улетку процьма наязджае ў вёску. Спрабавалі паласавацца мёдам і старыя. Першых Шурык выганяў з пляца запліскай, другіх — прысаромліваў. Працягвалася яго варта не вельмі доўга. Ігнась рэгулярна прыходзіў сюды, поркаўся ў вуллях, заходзіў іншага разу да Шурыка: перакінецца словам, нядобра зіркне і ходу. Пра разлік за старажоўства ні слова. А яму самому пра гэта нагадваць няёмка. Ды не так важны той заробак у Ігнася, як шкада было пасекі нябожчыка-дзеда — заўсёды спагадлівага і добрага, якога ён памятае змалку.

Невядома колькі б часу доўжылася яго вартаўніцтва, каб не захварэла на прастуду яго ўнучка. Раз'юшаная нечаканым горам жонка рашуча запатрабавала:

— Едзь к гэтаму скупердзяю — няхай дзіцяці лыжку мёду дасць, бясплатны служака.

— Мо сюды з'явіцца, падгледзіць — адбрэхваўся, як мог, ад жонкі Шурык, не маючы настрою сустракацца з тым.

На другі дзень, усё роўна як хто наказаў, Ігнась уранні з'явіўся каля пчол. У Шурыка пасля учарашняй сваркі з жонкаю ажно спала з душы скруха, кінуўся на радасцях да свайго выратавальніка і пытаецца:

— Унучка хварэе — мо шклянку мёду прадасі.

Той адчыніў вулей, пакорпаўся ў ім і цяжка ўздыхнуў:

— Няма, браце, у гэтым годзе мёду — што прынеслі тое і спажылі, лета сухое надта.

Шурык адчуў сябе аблітым памыямі, моўчкі пайшоў, не ведаючы як гэту гаворку перадаць жонцы, якая стаяла на падворку і, пэўна, чакала яго. І тут жа адразу накінулася:

— Дзе твой мёд, валацуга — дзіця ад ангіны агнём гарыць.

— Няма сказаў, сухмень — не нанасілі пчолы,— утуліў галаву ў плечы небарака і моўчкі падаўся ў хату, не ведаючы як яму быць далей. Жонка і ў хаце яшчэ доўга дапякала, пакуль не перапыніў:

— Не пляшчы языком — заўтра з'езджу ў горад, куплю, сёння позна — аўтобус пайшоў.

На другі дзень, як і паабяцаў жонцы, паехаў у райцэнтр. Ідзе па харчовым базары, пільна ўглядаецца, а тут, на табе. Сядзіць за прылаўкам, застаўленым рознакаліберными слоікамі з мёдам, Ігнась. І чарга выструнілася. Хацеў і ён туды ўшыцца ды надта брыдка на душы зрабілася пасля ўчарашняй просьбы. «Пэўна, мёд з дзедавых вулляў» — прамільгнула думка. Абмінуў скнару, купіў слоік у другога дзядзькі...

З тае пары кінуў вартаваць былыя дзедавы пчолы, хоць іншага разу да болю шкада было іх, як у далёкім маленстве...

Навальніца імгненна загнала Шурыка ў дрывотню. Ад напорыстых імклівых парываў ветру захісталася і злавесна зарыпела збітая некалі ім на хуткую руку будыніна. Яго пачаў апаноўваць страх — трэба было шукаць паратунку, недзе хавацца. Бегчы ў хату ніяк не выпадала — жонка па нейкай патрэбе падалася да дачкі і, адыходзячы, гукнула на дрывотню, што замкнула сенцы ад злодзеяў, якія адным часам панадзіліся ў вёску і выграбалі ўсё падчыстую. Пэўна, толькі цяпер ён зразумеў, што і ключы знесла, бо рабіць там яму не было чаго — меў намер пакалоць да вечара дровы. «Во папаўся дык папаўся,— у роспачы і разгубленасці прастагнаў ён і, звяртаючыся да Бога, тройчы паспешліва перахрысціўся: — Госпадзі, выратуй мяне ад гэтай навалы».

Будка-дрывотня з кожнай хвілінай усё мацней хісталася і трашчала, гатовая імгненна заваліць яго. Думкі ліхаманкай віхурылі ў галаве, як непагадзь у наваколлі перад ім, але выратавальная быццам некуды знікла. Страх з кожнай хвілінай мацнеў, ператвараючыся ў безвыходны жах. У гэтую хвіліну навальніца крыху сунялася, а бура яшчэ больш узмацнілася, згінаючы верхавіны дрэў да зямлі і ломячы з трэскам голле. Шурык, не знаходзячы ніякага выйсця, зноў тройчы похапкам перахрысціўся, баязліва вышыўся з дрывотні — і тут яго асяніла: «Пабягу пад дзедаву ліпу».

Не паспеў ён ступіць, як над галавой, сарваныя з яго хаты, з жахлівым свістам, праляцелі некалькі лістоў шыферу, у наступную хвіліну бура падхапіла, разам са страпіламі страху з дзедавай хаты і панесла на загуменне. Перакуленая дрывотня паляцела следам. Шурыка, як кавалак смалы, імгненна прыклеіла да камля зламанай яблыні, і ён, абвіўшы яе рукамі, з усёй сілы трымаўся, не губляў надзеі неяк вырвацца з гэтага пекла, зіркаў на дзедаву ліпу як на сваю выратавальніцу.

Але тое, што ён убачыў і адчуў, падалося яму канцом свету. Зямля пад ім ускалыхнулася і загудзела — ліпу вырвала з карэннямі, падняло ў паветра, патрымала на вышыні некалькі хвілін, вынесла на вуліцу і кінула на дарогу акурат насупраць яго, Шурыкавай, хаты, нават пачуў як шаснула галінамі па сцяне і дзынкнулі ў вокнах разбітыя шыбы. Спалохана пазіраючы на нядаўняе здарэнне, небарака зноў тройчы перахрысціўся за тое, што бура не вальнула дзедаву ліпу, такую гаргару, на хату — быў бы ёй гамон!

Навальніца паступова сунялася, бура грымотна адкацілася некуды далей, аціх дождж і Шурык паспешна ўсхапіўся, прамоклы да нітак, азірнуўся наўкола. Ад убачанага схаладзела сэрца. Сіратліва чарнела ад дажджу хата, з парванай страхой і выбітымі шыбамі. Дрывотня, са знесенай дзедавай саламянай страхой, поруч ляжалі ў канцы пляца на загуменні. Каля іх бязладна валяліся перакуленыя бурай вуллі. Згледзеўшы такое, ён ад жалю ледзь не заплакаў.

Бура прайшлася і па суседніх сядзібах. Яшчэ нацямочку, да ўзыходу сонца, пачалі рупіцца мужчыны. Не ўзяў усю ноч сон і Шурыка. Як засінела ў вокнах з разбітымі шыбамі раніца, пабег да свайго неразлучнага сябрука Венькі Коршака, з якім разам даглядалі на ферме быкоў, расказаў пра сваю бяду. У таго пабудоў бура не кранула, толькі зламала некалькі яблынь. Сябрук хуценька адзеўся і, пачуўшы, што нарабіла бура з напарнікавай гаспадаркай, заспяшаўся:

— Хадзем дах правіць, а то як ліне дождж — усю хату залье.— І папытаўся: — Калі няма шыферу — у мяне вазьмі.

Яны пагрузілі на каляску некалькі лістоў шыферу, давезлі да Шурыкавай сядзібы і ўзяліся латаць дах. З вышыні ім добра бачылася разложыстая ліпа. І Коршак, акінуўшы позіркам незвычайных памераў вываранцень, пацікавіўся:

— А што будзем рабіць з гэтай гаргарай — па вуліцы ж ні праехаць, ні прайсці.

— Церабіць трэба, — адказаў Шурык і папытаўся: — Бензапіла твая спраўная?

— Чаму ж не — трэба ісці па яе,— запэўніў гаспадара сябар, злазячы з даху.

Пакуль той хадзіў па бензапілу, Шурык узяўся церабіць ліпу — абсек некалькі танчэйшых галін, тоўстыя пакінуў пільшчыку — сякерай ён не мог даць рады. Ад яго ўдараў адна за другой з шыракаватага дупла пачалі вылятаць пчолы і сталі кружыцца над паваленай дзедавай ліпай. Ён нават і ўявіць не мог, што ў старой ліпе, сярэдзіна якой за стагоддзі выгніла, стаў прыдатным сховам для пчол.

Коршак неўзабаве з'явіўся, паставіў долу свой агрэгат і, заўважыўшы пчол, якія рухава выпаўзалі з дупла, імгненна ўзляталі і працягвалі пагрозліва кружыцца, сказаў:

— Сёння, Шура, мы з табой мёду паспытаем—толькі як яго ўзяць. У цябе недзе была пчалярская сетка — нясі яе, а то заядуць.

Той паслухмяна кінуўся ў хату, вынес патрэбную прыладу, і Коршак, нацягнуўшы яе, узяўся абразаць тоўстыя галіны, пакінутыя Шурыкам. Той, падцерабіўшы іх, сцягваў з дарогі, акуратна складваў каля былой дрывотні, маючы намер папілаваць на дровы.

Тым часам вестка пра пчол, якія пасяліліся ў дзедавай ліпе, выкарчаванай бурай, маланкай разнеслася па вёсцы. Да Шурыкавага падворка пацягнуліся дарослыя і дзеці паглядзець на дзіва, а калі пашэнціць — паспытаць дармавога мёду. Вяскоўцы стаялі воддаль, баючыся блізка падыходзіць, бо ў паветры гойсалі разлаваныя пчолы, абараняючы свой апошні прытулак. Гаспадар спрабаваў адвадзіць няпрошаных гасцей, але тыя нават не кранулісь з месца — упарта і цярпліва чакалі, пра нешта між сабой перамаўляліся.

Пільшчык скончыў абрэзку галін, цалкам агаліўшы камель, прапанаваў сябруку:

— Давай дабываць мёд, а то яны ад нас не адступяцца.— І, кіўнуўшы на зборышча няпрошаных гасцей, растлумачыў: — Пачну каля дупла — там, у сяродку, павінны быць соты.

Ён бзыкнуў у паветры газам, як быццам прыцэліўся да таго нябачнага мёду, і апусціў пілу на камень каля загадкавага дупла, з якога струменем пасыпалася пілавінне. Імгненна адвалілася верхавіна, з якой роем рынулі на волю пчолы, ратуючыся ад нечаканага рабавання і абараняючы сваё адвечнае жытло. Яны кружылі над пільшчыкам, спрабуючы адагнаць яго ад ліпы, але смуродлівы бензінавы выхлап сунімаў іх наступ і прымушаў адступаць, узнімацца вышэй у неба і ўжо адтуль зноў атакаваць.

Шурык, пазіраючы на пчаліную баталію з яго сябрам-пільшчыкам, са страхам у душы адступіўся ад ліпы бліжэй да натоўпу — пабаяўся, што пчолы могуць імгненна накінуцца і на яго.

Адваліўшы верхавіну ліпы каля самага дупла, яго сябрук адпілаваў некалькі калодак, запоўненых сотамі і даў каманду:

— Забірайце мёд!

Першая вылучылася з натоўпу і кінуліся да пільшчыка высокая, як жэрдка, прагная Шурыкавая суседка. Ухапіла калодку с сотамі, з якіх выцякаў мёд, і дала дзёру цераз дарогу, на свой падворак. Ды не дабегла. Атакаваная пчоламі, кінула каля варот бясплатную здабычу, павалілася, як падкошаная, долу і пачала ліхаманкава махаць рукамі, спрабуючы неяк абараніцца ад лятучых даганялаў. І, уджаленая пчоламі, клікала на дапамогу мужыка. Той ухапіў галіну з ліпы і, размахваючы ёю ў паветры, шыбануў да жонкі.

Шурыкава жонка пабачыла, што ёй, як суседцы, ухапіць калодку з сотамі будзе не так проста, накінулася на мужыка:

— Чаго стаіш, ёлупень бязмозглы, бяры ідзі, а то людзі расхапаюць.

— Бяры, калі трэба — я мёду ня ем, — злосна агрызнуўся той і нават не зрушыўся з месца.

Жонка, нязграбна перастаўляючы ногі, падбегла да пільшчыка, падняла аберуч калодку і кінулася ў сені. Уджаленыя пчоламі яе твар і губы пачалі ўвачавідкі пухнуць, усё роўна як яна імгненна пасыцела.

Услед за Шурыкавай жонкай, як па камандзе, падляцелі да папілаванага камля некалькі хлапчукоў, ухапілі па калодцы і, ратуючыся ад пчол, паімчаліся да выратавальнай сажалкі. Мужчынам ад старасвецкага вулля нічога не засталося і яны, пагаманіўшы з хвіліну, пачалі разыходзіцца.

Коршак заглушыў бензапілу, зняў пчалярскую маску і стомлены напружанай ды небяспечнай работай, сеў на лаўку поруч з Шурыкам, сказаў цішком:

— Там яшчэ мёд ёсць — ліпа дуплаватая да каранёў. Відаць, пчолы тут спрадвеку вяліся, ды выняць яго адтуль не мог нават нябожчык дзед: — Ён закурыў, выцер узмакрэлую, злямчаную ад поту чупрыну, прапанаваў: — Як сцямнее і аціхнуць пчолы адрэжам і сабе па калодцы — увесь камель, браце, запоўнены сотамі.

Шурык колькі хвілін сядзеў моўчкі, пыхцеў самакруткай, быццам не чуў сябруковай гамонкі, думаў пра нешта сваё. Затаптаў ботам акурак, гаротна ўздыхнуў, як апошняе ў печ укінуў:

— Дарма, Веня, мы пчалінае жытло знішчылі. Трэба было ацерабіць ліпу, а камель з пчоламі дзе-небудзь на дзедавым участку паставіць — няхай бы заставалася памяць.

— А хто такую гаргарыну падыме ці пацягне — хіба толькі трактарам, — засумняваўся той у сябравых довадах і папракнуў: — Твая ж Маня першая закамандавала пілаваць камель — надта ей мёду хацелася.

Гамонка іх у той дзень скончылася познім вечарам. Прыцемкам Веня адпілаваў ад камля яшчэ два кругі з сотамі: адзін — Шурыку, другі — сабе, бо далей у старасвецкай ліпе ішоў пусты асяродак. Усё астатняе пільшчык пусціў на дровы.

Як скончылі работу Шурык прапанаваў:

— Хадзем у хату, па кроплі возьмем — змардаваліся за дзень з дзедавай ліпай. — Шурык зноў заклапочана ўздыхнуў: — Па мне няхай бы яна яшчэ сто гадоў сядзела з тымі пчоламі — дык жа буру нячыстая прынесла.

Апухлая ад шматлікіх жалаў Шурыкава жонка паставіла на стол закуску — малосольныя гуркі, сала, зняла з паліцы паўлітэрку, ледзь варухнула апухлымі, як кілбасы, вуснамі.

— Вы, хлопцы, сёння большага заслужылі за такі мёд. Я укінула кавалачак сотаў у рот — то аж горла раздзірала, не магла вады адпіцца. Гэта не базарны, якога можна чорт ведама колькі з'есці.

— Дзедаў мёд без падробкі, і невядома колькі гадоў ён там настойваўся, — з выразам вялікага знаўцы на твары ўда-

(Заканчэнне на стар. 14)

Арт-пацеркі

Адпаведна нядаўняму ўказу Прэзідэнта РБ, саліст Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі, уладальнік цудоўнага тэнара Сяргей Франкоўскі ганараваны званнем "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь", а выкладчыцы Гродзенскага музычнага вучылішча, таленавітаму хормайстру Ларысе Іконнікавай нададзена званне "Заслужаны работнік культуры Беларусі".

Як прысвячэнне Міжнароднаму дню музыкі ўспрыняла сталічная публіка першую ў гэтым сезоне імпрэзу Беларускага таварыства сучаснай музыкі. Канцэртная праграма, зладкаваная гэтай творчай суполкай, прагучала ў Зале камернай музыкі, што на Залатой Горцы, і падаравала меламанам букет свежых разнастайных уражанняў. На афішы суседнічалі творы сусветных класікаў XX ст. ды іх беларускіх сучаснікаў, а яшчэ і прэм'еры найноўшай музыкі айчынных кампазітараў. Арганізатары канцэрта прыгадалі спадчыну нашых суайчыннікаў Я. Дзягцярыка, А. Друкта, звярнуліся да творчасці італьянца А. Рэспігі ды амерыканца Ч. Айвза, прэзентавалі інструментальныя ды вакальныя навінкі актыўных чыннікаў свайго таварыства, сярод якіх Д. Лыбін, Г. Кароткіна ды інш.

Свой пятнаццаты сезон распачаў Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра "Зьніч". Першым спектаклем сталася рамантычная монаопера А.Залётнева на лібрэта і ў рэжысуры Г.Дзягілевай "Адзінокі птах". Як вядома, прэм'ера гэтага твора, інспіраванага падзеямі апошняга дня жыцця Адама Міцкевіча, адбылася некалькі гадоў таму ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, яшчэ да пачатку вялікага рамонту. Цяпер таксама была прэм'ера — новая пастановачная версія, адаптаваная на камерныя сцэнічныя ўмовы стацыянарнай залы тэатра "Зьніч", што ў культурным цэнтры пры сталічным Касцёле св. Сымона і св. Алены. Саліст Нацыянальнай оперы М. Жылюк, як і раней, — выканаўца галоўнай партыі.

"Варшаўская графіка ў Мінску" — выстаўка пад такой назвай будзе працаваць у сталіцы да 14 лістапада. Творы польскіх мастакоў экспануюцца ў галерэі "Універсітэт культуры" (Палац Рэспублікі).

"Тэатральны куфар-2004", першы Міжнародны фестываль тэатральнай студэнцкай творчасці, арганізавалі ўпраўленне па справах культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта ды народныя тэатры БДУ "На балконе" і "На філфаку". Апроч беларускіх студэнцкіх калектываў, удзельнічалі госці з Вялікабрытаніі, Расіі, Швейцарыі. Галоўную ўзнагароду — прыз глядацкіх сімпатый — атрымаў тэатр Цэнтра эстэтычнага выхавання і развіцця асобы Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта.

С.ВЕТКА

Аляксандр КРАСНАГЛАЗАЎ нарадзіўся на Украіне. Там, у Луганску, прайшло ўсё яго дзяцінства і юнацтва. Звычайныя, на першы погляд, гады. Вучыўся, з сябрамі на вуліцы мячык ганяў... А яшчэ танцаваў, з самага маленства.

«Не шкадуй сябе...»

— Аляксандр Дзмітрыевіч, адкуль жа ў вас такая любоў да танцаў?

— Цяжка нават адказаць. Відаць, атрымаў у спадчыну. Майго бацьку ведалі амаль усе данчакі (жыхары ля Дона). Ніводнае вяселле не спраўлялі без яго і яго сябрабаяніста. Ад усёй душы таньчыў, і слёзы, і ўсмешкі на тварах людзей выклікаў, заўсёды быў рады "паказаць сябе".

Маленькі ж Саша таксама марыў, каб яго ўбачылі. Спрабаваў, і не раз, паступіць у школьную самадзейнасць, але адмаўлялі, бо росту быў невялікага. У 13 гадоў яго ўзялі-такі ў школьны ансамбль "Рапсодыя". Многія з тых, хто там займаўся, працягнулі навучанне ў Вірскага, Ігара Майсеева, спраўдзіліся як прафесійныя танцоры. Між іншым, валодалі многімі працоўнымі спецыяльнасцямі. Аляксандр яшчэ ледзь не зрабіўся прафесійным спартсменам. Яго нават узялі ў зборную Украіны па акрабатыцы. Бацька ж ніколі не падбіваў яго стаць ні ўрачом, ні настаўнікам, ні танцорам, — галоўнае, "каб не быў бандытам", не звязаўся з ліхімі кампаніямі і вучыўся.

— Школа дала вам магчымасць для старту. Ці думалі вы зрабіць працяг і паступіць на харэаграфічнае аддзяленне ў якую-небудзь навучальную ўстанову?

— Думаў... Але спачатку трэба было аддаць абавязак Радзіме. Пайшоў у войска. Служыў у Германіі. Я там нават свой ансамбль стварыў невялічкі. А пасля ўжо вырашыў праверыць, ці згаджуся для сапраўднага танцавальнага калектыву. Хадзіў на іспыты. І што цікава, атрымаў запрашэнне ад двух украінскіх калектываў адначасова.

— Але ж, я ведаю, вы не засталіся ў роднай старонцы, а паехалі у Мінск. Чаму?

— Мой добры знаёмы, артыст балета з Мінска, прапанаваў прыехаць і паспрабаваць свае сілы ў Беларусі. Я згадзіўся. І трапіў у вайсковы ансамбль, у якім працаваў да 1965 года.

Аднак мара дзяцінства аб прафесійнай сцэне ўсё больш займала думкі Аляксандра. Яму было добра ў вайсковым ансамблі: і паважалі, і атрымоўвалася ўсё, але не бачыў ён перспектывы. Вось і вырашыў перайсці ў іншае месца. Але ўласнага жадання аказалася мала. Кіраўнік ансамбля ніяк не хацеў расставацца з таленавітым юнаком. Ды ўрэшце пажадаў поспехаў і падпісаў заяву.

— Аляксандр Дзмітрыевіч, нават такому энергічнаму чалавеку, як вы, напэўна, цяжка было трапіць у Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі?

— Канечне. У той час, каб прайсці іспыты, трэба было ведаць і беларускія, і рускія, і украінскія кампазіцыі і, вядома ж, выконваць усё дакладна, з пачуццём, энергічна. Але ў мяне з першага разу атрымалася. Можа, таму, што працавіты і лічу, што трэба паказваць людзям лепшае з таго, чым валодаеш, не шкадаваць сябе.

— А ці была ў вас візітная картка, нумары, якія заўсёды прымаліся на "ўра"?

— Заўсёды быў узорам з-за "Млына" і "Кубарыка". І на пенсію калі ўжо выйшаў, запрашалі, каб паўтарыў гэтае трукацтва. Рухацца бездакорна правільна на сцэне — гэта вельмі важна, але трэба і адчуваць публіку, яе настрой, абменьвацца з ёю энергіяй. І так — цэлых 20 год. Будучы салістам, аб'ездзіў Аляксандр Дзмітрыевіч усе рэспублікі былога СССР, быў у Польшчы, Італіі, Германіі, Бельгіі, Нікарагуа, Сальвадоры... Асабліва цікавым і незвычайным аказаўся візіт у Ташкент. Давялося даваць канцэрт у экстрэмальных умовах: землятрусы суправаджалі гастралёраў паўсюль. Але ж Дні культуры адмяняць было немажліва: прысутнічалі важныя дзяржаўныя асобы, і артысты мусілі паказаць усё, на што здатныя.

— Я ведаю, што ў вас ёсць сястра: ці абрала яна такі ж шлях?

— Так, Валянціна скончыла эстрадна-цыркавую студыю ў Кіеве, аддзяленне харэаграфіі. Працавала ва Укрканцэрце, прычым, 20 гадоў, што вялікая рэдкасць для балерыны. І сям'я ў яе артыстычная: муж — артыст размоўнага жанру, дачка — спявачка.

— А каго вы лічыце лепшымі сваімі настаўнікамі? Хто зрабіў з вас сапраўднага майстра?

— Гэта Аляксандр Апанасенка, колішні мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, балетмайстры Сямён Дрэчын і Генрых Маёраў.

— Цікава, як вашы дзеці ставіліся да вашай працы?

— Старэйшы сын Ігар, напэўна, як і я, палюбіў танцы з самага маленства. Я заўсёды браў яго на канцэрты. Ён так прывык да гэтай атмасферы, што не ўяўляў іншага далейшага жыцця. Казаў, што толькі танцамі ў будучыні і зоймецца, прычым прафесійна. Я не пярэчыў. Ён амаль самастойна ішоў да сваёй мэты. Вытрымаў іспыты ў харэаграфічнае вучылішча, калі я быў на гастролях у Сібіры. Другі мой сын Віталь аднойчы зайшоў да брата ў вучылішча, агледзеўся, прайшоўся туды-сюды — і захапіўся. Казаў, што абавязкова будзе вучыцца менавіта тут. І стрымаў слова! (Сёння Віталь Краснаглазаў — вядучы саліст балета ў Дзяржаўным музычным тэатры, дыпламант Міжнароднага конкурсу артыстаў балета. — **А.С.**).

— У вашай сям'і ўсе хлопчыкі?

— Не, на шчасце, у мяне ёсць малодшая дачушка Саша. Яна марыць таксама пра будучыню балерыны. Яе мэта — разам з братам выканаць галоўную ролю ў "Кармэн-сюіце". Пакуль яна вучыцца ў харэаграфічным каледжы.

Дзеці займаліся любімай справай, а бацька пасля плённай працы ў Дзяржаўным ансамблі танца мусіў выйсці на пенсію, хаця энергіі яшчэ хапала. Сям'я ж — вялікая, карміць яе трэба было. Вось і даводзілася нейкі час разгружаць машыны з садавінай. Але гэтага чалавека памяталі як таленавітага танцора. Не раз бачылі яго трыумф і майстэрства, таму, мабыць, і прапанавалі выкладаць харэаграфію ў Палацы культуры прафсаюзаў. А потым, таксама нечакана, было запрашэнне на працу ў летні лагер.

— Аляксандр Дзмітрыевіч, як там сустрэлі вас дзеці? Мне здаецца, што яны прыязджаюць у лагер, не каб вучыцца, а наадварот, гуляць, знаёміцца адно з адным, сваволіць. Так?

— Ёсць у гэтым праўда. Я спачатку думаў, што дарма прыехаў, хацеў збірацца назад. Але ж не такі я чалавек. Калі пачаў, скончу. Тым больш, што на дрэнны настрой часу не хапала. Кожны дзень нейкія святы, а да іх трэба было рыхтавацца: падбіраць касцюмы, ставіць танцы. А ў школах пачаў настаўнічаць у 1985 годзе. Цяпер працую ў школе з харэаграфічным ухілам.

— Кажуць, што будучага журналіста ці пісьменніка нельга навучыць пісаць, а ці можна навучыць танцам?

— Харэаграфія — гэта дысцыпліна, па якой не знойдзеш падручніка, усё неабходна паказаць на практыцы. На жаль, даводзіцца часам назіраць такую карціну: сядзіць сабе малады педагог і дыктуе, у якую пазіцыю стаць, які рух зрабіць... А як жа сам? Хто будзе зараджаць дзяцей любоўю да танцаў? Хто будзе для іх прыкладам?

— Але ж ці магчыма пяць гадзін, амаль без перапынку, паказваць вучням розныя кампазіцыі?

— Магчыма. Галоўнае — жаданне. Я заўсёды стараўся працаваць, каб не прысесці. Хварэў, напэўна, толькі адзін раз за ўсё маё педагагічнае жыццё.

— Падзеліцеся сакрэтам бадзёрасці?

— Канечне. І нічога тут складанага няма. Мой прынцып: баліць горла — з'еш нечага халоднага, нага — не зважай на яе, працягвай рухацца... І як бы незвычайна гэта ні было, але ж боль знікае.

— І яшчэ адно, адвечнае пытанне да вас. Якім вы бачыце пакаленне XXI стагоддзя? Ці ёсць у яго творчы патэнцыял?

— Ва ўсялякі час знаходзіліся выдатныя людзі. Але я пачаў заўважаць, што гэтае пакаленне цяжка нечым зацікавіць, здзівіць. Маладыя людзі нейкія пасіўныя. Раней не было месцаў для ўсіх жадаючых займацца самадзейнасцю, а зараз бацькі прымушаюць дзяцей чымсьці ў вольны час займацца.

Тым не менш, Аляксандр Дзмітрыевіч Краснаглазаў змог выхаваць не адзін клас школьнікаў. Ім апекаваны ансамбль "Славяне" нядаўна стаў дыпламантам фестывалю "Сузор'е надзей". І па сёння ад свайго галоўнага жыццёвага прынцыпу: "Не шкадуй сябе, тады і вынікі будуць", — гэты чалавек адмаўляцца не збіраецца.

Аляксандра САКАЛОВІЧ

Дыярыюш сненняў

Сюрпрыз з берагоў Нявы: нотны сшытак, у якім 10 арыгінальных аўтарскіх твораў для голасу і фартэпіяна плюс апрацоўка вядомай мелодыі. Вось такі атрымаўся "Пецярбургскі дыярыюш".

Такім чынам, у зборніку прадстаўлены вакальныя творы на вершы беларускіх паэтаў — класікаў, сучаснікаў (у тым ліку й піцерцаў): Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Валянціна Таўлая, Надзеі Артымовіч, Аўгінні Кавалюк, Анатоля Кірвеля, Яўгена Бартніцкага (сапр. Сяргей Сурыновіч), Наталлі Арсенневай... Кардынатар гэтага нотадруку, выдадзенага накладам 150 экземпляраў, — "Независимая творческая ассоциация любителей изящной словесности "Новая Беларусь". Аўтар — вядомы піцерскі кампазітар, доктар мастацтвазнаўства, спецыяліст у галіне этнаінструментаў, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук, чалец Міжнароднага савета ЮНЕСКА па традыцыйнай музыцы, заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны і Польшчы Ігар Маціеўскі.

Самымі рознымі традыцыйнымі і авангарднымі тэхнікамі валодае І.Маціеўскі, у мастацтве якога спакроўлены інтэлект і творчы талент, фантазія і эрудыцыя. Добрае адчуванне прыроды моўнай інтанацыі спрыяе спеўнасці яго меладызму. Прычым, у беларускіх творах І. Маціеўскага няма цытат, бо фальклор трактуецца ім як глеба для самавыяўлення.

Свежае гучанне надае кампазітар кананічнаму тэксту малітвы "Вітай, Марыя" (можа выконвацца ў суправаджэнні аргана). Спалучае кананічную ж народную калыханку з вершам Яўгена Бартніцкага, разгортваючы адмысловае "полідзеянне", калі ледзь чутнае "люлі" спрычыняецца да арыгінальнага тэксту і вобраз, які нібыта стварае фон, урэшце апыньваецца на першым плане...

Сапраўды, з вынаходлівым, сур'ёзным і шматаблічным творцам знаёмяць нотныя старонкі: тонкая вакальная паэма на вершы М. Багдановіча "Касцёл св. Анны ў Вільні", песня-раманс на вершы А.Кірвеля "Летні сон", нервовы імпульс паэтычнага слова Н.Артымовіч, адценены гукапісам, — "Сплю ў шэрых снягах".

Наколькі рознай — і маляўніча складанай, і празрыста-немудрагелістай — бывае гарманічная мова, наколькі развітай або выразнай у стрыманасці скарыстаных сродкаў паўстае фартэпіянная фактура! Каб на гэта падзівіцца, дастаткова параўнаць хаця б пару-тройку рамансаў. Сярод іх, напрыклад, "Nocturno" на вершы А.Гаруна — разгорнутая музычная сцэна з відавочнымі рысамі балады, са зменай тэмпаў, што дапамагае прачуць своеадметную філасофію паэта. І арганічна спалучанае з традыцыйнай беларускай песеннасцю прачытанне вершаў В.Таўлая "Шумяць бары", "Малой сястрычцы". І — апрацоўка музычнай тэмы "Магутны Божа", гімна Міколы Равенскага, — цікавы камерны варыянт знаёмага харавога песняспеву...

Выпадкова ці не, а тэксты спеўнай падборкі, змешчанай у "Пецярбургскім дыярыюшы", вызначаюцца пэўнай сэнсавай тэндэнцыяй. Душа, у найтанчэйшым, сакральным азначэнні, — гераіня вакальна-паэтычных твораў, лейтматывы бальшыні якіх высноўваюцца з вобразаў малітвы, мроі, сну, снення. Зрэшты, на тое і дыярыюш: спавядальня самотніка, люстэрка душы, прытулак мараў, згадак і сненняў...

Напэўна, творы, з якіх складзены "Пецярбургскі дыярыюш", у ахвотку выконвалі б і нашы вакалісты. Мажліва, так і атрымаецца. Бо І.Маціеўскі штогод бывае на Беларусі, у Магілёве — працуе ў журы Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі "Магутны Божа". А там, як правіла, спеўны творчы люд абменьваецца нотамі.

Варта назваць яшчэ імёны дзвюх вядомых на Беларусі асоб, спрычыненых да "Пецярбургскага дыярыюша". Гэта яго ўкладальнік і адказны рэдактар Анатоль Кірвель ды музычны рэдактар, кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік Расійскага інстытута гісторыі мастацтваў (СПб) Галіна Таўлай. Дарэчы, у яе прадмове да зборніка ёсць імкненне пазначыць рысы творчай індывідуальнасці І.Маціеўскага, ахарактарызаваць стыль кампазітара. Сам ён сёння "дзівіцца, што беларускае слова гэтак шчыра, пяшчотна, паўнаважна адгукаецца ў ягонай душы, нібы змагаецца на першынство з не менш родным яго сэрцу ўкраінскім, польскім, рускім", — зазначае Г.Таўлай.

У нядаўнім мінулым, пры канцы 80-х, ён, ужо сталы і знаны музыкант, адкрыў для сябе Багдановічаў "Вянок". Тады за адзін толькі год нарадзіліся "песнявершы" — больш як паўтара дзесятка. Так пачыналіся ўваходзіны І.Маціеўскага ў мілагучны свет беларускай паэзіі. З тае пары кампазітару-піцерцу і "сняцца сны аб Беларусі"...

С.БЕРАСЦЕНЬ

Тэатральная паноў...

Казачных персанажаў, якія трывала абжылі літаратурную і драматургічную прастору Беларусі, нядаўна адкрыў для сябе тэатральны Ужгарад (Украіна). Да Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Інтэрлялька-2004», які сабраў удзельнікаў з Аўстрыі, Босніі і Герцагавіны, Венгрыі, Германіі, Польшчы, Расіі, Румыніі, Славеніі, Украіны, Харватыі, Чарнагорыі, Швецыі, спрычыніліся і беларусы — калектыў Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка» (Маладзечна). Ён прадставіў спектакль «Дзівосныя авантуры» паводле вядомай п'есы Пятра Васючэнкі і Сяргея Кавалёва.

Ізноў паны Кубліцкі ды Заблоцкі, гэтыя шалапуты неўтаймоўныя, дэманстравалі шляхецкія заняткі, звязаныя з паляваннем, баляваннем, вайной ды амурамі, наседжвалі яйка з-пад Куры Шчабятуры, заляцаліся да Дзеўкі Дрыпы і здзяйснялі ў яе гонар геройскія подзвігі, у чым ім дапамагалі акцёры тэатра Міхаіл Асановіч, Таццяна Паўлючук, Віктар Піліпенка, Таццяна Чаеўская.

Авантуры беларускай шляхты, якія развіваліся ў жанры рыцарскай п'есы, любоўнай гісторыі, бурлеска, філасофскай прыпавесці, надта спадабаліся ўкраінскім гледачам. Іх сімпатыі падзяліла журы, якое ўзнагародзіла батлейкаўцаў адмысловым дыпломам «За наватарскае прачытанне драматургіі». Няхай паны Кубліцкі ды Заблоцкі галёкаюць віваты з нагоды гэтай найвышэйшай тэатральнай перамогі, але славу ім давядзецца падзяліць не толькі з акцёрамі, але і з рэжысёрам Уладзімірам Уладыкам і мастаком Вольгай Разумавай, якія стварылі унікальны хранатоп, дзе жывуць, бядуюць, сварацца і радуюцца знакамітыя паны.

П.В.

З польскай паэзіі эпохі мадэрн

Адам АСНЫК

* * *

Паміж намі не гучала
Аніякіх слоў прынадных,
Нас нічога не злучала,
Апроч хмар вясновых
здрадных,

Апроч водару і бляску,
Што насіліся ў прасторы,
Апроч траў на лузе й красак,
Што вялі гаворку з борам,

Апроч ліўневых каскадаў,
Што бруіліся ў растоках,
І вясёлкавых гірляндаў,
Што свяцілі з-пад аблокаў.

Апроч слодычы натуры,
Што нам сэрцы чаравала,
Разлівалася па скуры,
Нас нічога не злучала.

Антоні СЛОНІМСКІ

Жаль

Пераклад прысвячаю пану Генрыку Маецкаму ў Беластоку

Калі першы раз цябе ўбачыў,
Мокрыя пахлі каштаны.
Ты ў вочы мне доўга
глядзела —
Я быў сам не свой, змяшаны.

Услед за табой я крочыў
Пад мокрымі шатамі дрэў.
Твой позірк фіялкавы слодыч
Мне ў сэрца ўліваў і грэў.

Даўно знябытыя словы
Адкрылі свой першасны сэнс,
І я зразумеў нанова,
*Што **бэз** так пахне, як **бэз**,*

Што чысты струменіць
водар
*Ад слова **водар** ізноў,*
Што тайнаў дапяў прыроды
Ў значэннях тых
простых слоў.

*І слова забытае **смутак***
Мне адкрылася ўглыб
і ўдаль...
Як жа многа сэнсаў закута
*Ў кароценькім слоўку: **жаль**.*

Юліян ТУВІМ

Сярдзіты верш

Ты не ведаеш. Быў дождж,
Я блукаў пад ім бязладна,
І шукаў цябе, чакаў я
У тузе пякельнай, здраднай.

Ты не ведаеш. Быў злы.
І пайшоў я піць з тым болем:
Піў гарэлку, піў наліўку,
Ох, і быў жа я вясёлым!

Ты зірні: нікчэмны верш,
Але ж ён сярдзіты,
гнеўны,
Бо чакаў цябе,
шукаў я
Ў хмуры вечар той залеўны.

Баляслаў ЛЕСМЬЯН

* * *

Хмельсь ў сэрцы маім, хмель
Грудак, ноччу цалаваных,
Што сваю мне дораць бель
Аж пакуль не блісне ранак.

Скварся ў целе маім, сквар
Дакрананняў ручак мілых,
Што крыві нястрымнай вар
Бледным роздумам змянілі.

Грайся, вогнік свечкі, грай
На пасцелі, на ільнянай,
Трапятліва патурай
Тайнам пары закаханай.

Ружа

Хто кінуў на пуціны
Чырвоных макаў промні?
Меў сон я нейкі дзіўны,
Які ж — ніяк не ўспомню.

Твае былі то вусны?
Мае былі далоні?
У садзе маім пуста —
Ні ружы, ні півоні.

Самоту не адужаць,
Збягаюць дні паволі.
Ці зацвіцеш ты, ружа?
"Не зацвіту ніколі..."

"Не зацвіту ніколі..."
Твой голас быў то, ружа?
Не зведаць мне патолі,
Самоты не адужаць.

Леапольд СТАФ

Я крочу ў восень...

Я крочу ў восень,
ты — вясну гукаеш,
Усё нас дзеліць,
і без прабачэння,
Хоць ты мяне чаруеш,
спакушаеш,
Гляджу на твар твой
з жалем адрачэння.

Але ж такі дарунак —
ты на грудзе
Руіны дзён маіх,
дзе сціхлі шалы,
Што нават крэп жалобы
ў сэрцы будзе —
Як успамін святла,
ў святле прапалы.

Казімір ПШЭРВА-ТЭТМАЕР

* * *

У цудоўнай цела твайго чары
Залатым віном
жыццё бруіцца.
Той трыкроць,
трыкроць шчаслівым стане,
Каму ты дасі з яе напіцца.

У цудоўнай цела твайго тоні
Тонуць вочы,
бы ў азёрнай хвалі,
І назад вярнуцца немагчыма
З тых глыбінь,
дзе перлы і каралы.

Пераклад з польскай мовы Ірыны БАГДАНОВІЧ

Канстанцін ВАЙТОВІЧ:

"Я працую дзеля маральнага задавальнення кожнага гледача"



Тут жыве дзяцінства

"Клоунаў у паэзіі больш няма; іх можна ўбачыць толькі ў цырку. Як добра, што сустракаеш іх там, і як шкада, што іх нідзе больш не сустрэнеш", — сказаў аднойчы Андрэ Сюарэс. Дзіўна... А я заўважыла: калі трапляеш у цырк, адчуваеш, што гэта месца, дзе час спыніўся, бо толькі тут кожны чалавек зноў і зноў вяртаецца ў дзяцінства. Таму і прываблівае гэты цудоўны казачны свет, дзе жывуць мядзведзі, сланы, малпы і вясёлыя клоуны. Да кожнага новага сезона клоуны чысцяць сваю вопратку, прышываюць да касцюма бліскаўкі, якія асыпаліся падчас трукаў, кладуць латкі на свае шоўкавыя туфлі. Але яны не змяняюць ні грыма, ні грымасаў. І ў нашай памяці, якая ахвотна паддаецца падману, клоун заўсёды прадстае такім,

якім ён зачароўваў нас у дзяцінстве.

Так, кожны клоун здаецца нам падобным на мноства смешных, размаляваных блазнаў. Аднак, калі прыгледзецца ўважліва, можна заўважыць, што кожны артыст і выглядае і ўздзейнічае на публіку па-свойму. Цікава, што з даўніх часоў была традыцыя, што пасля вучобы малады цыркач прымаў імя настаўніка. Менавіта ў гэтым факце заключана адна з прычынаў незвычайнай устойлівасці некаторых цыркавых дынастый, прозвішчы якіх аднолькава насілі як прамыя нашчадкі, так і вучні.

Аднак нічога агульнага паміж гэтым фактам і жыццём майго героя няма. Ён пачынаў сваю працоўную дзейнасць у сценах цырка ў якасці асвятляльніка, і ні ў якім разе не думаў, што стане артыстам... Знаёмцеся: самы малады клоун Беларусі Косця (Канстанцін Вайтовіч).

У снежні мінулага года Косця прыйшоў працаваць у цырк асвятляльнікам (як ён сам прызнаецца, не ад добрага жыцця). "Маладым заўсёды хочацца якога-небудзь прагрэсу, таму я рызыкнуў пайсці на манеж, не ведаючы, што ўсё так атрымаецца", — расказвае малады чалавек. Сёлета падчас падрыхтоўчай працы над аўтарскім праектам Таццяны Бандарчук "Прысвячэнне", ён прыйшоў да мастацкага кіраўніка і папрасіў паспрабаваць сябе ў якасці клоуна. "Паколькі ў цырку працуюць вельмі добрыя людзі, мне не адмовілі, — узгадвае Косця. — Са мной працавалі спецыялісты, у тым ліку і балетмайстар Аксана Волкава. І пасля зробленай рэпрызы, у рэшце рэшт мяне ўзялі".

Аднак розніцу паміж працай асвятляльніка і клоуна Косця адчувае і зараз, паколькі ў першым выпадку ён дакладна ведаў, які рычаг трэба націснуць, якую ручку павярнуць... У прафесіі ж клоуна галоўнае — настроіцца на патрэбны лад. Для гэтага існуе шмат спосабаў. "Варта за кулісамі паглядзецца ў люстэрка, пакрыўляцца і забыцца пра ўсе няшчасці на дзесяць хвілін, каб прадэманстраваць публіцы максімум сваіх магчымасцяў. Праўда, гэта вельмі складана, — тлумачыць Косця. — Калі прыходзіш у цырк і бачыш толькі палову залы, адразу падае настрой". Паколькі рэпрыза "Аркестр", якую выконвае клоун, стаіць у канцы першага аддзялення, увесь гэты час ён спрабуе настроіць сябе на думку, што і палова залы — гэта не горшая публіка і для яе таксама трэба працаваць.

І стомленасць і захапленне...

Самым складаным пры выступленні з'яўляецца выбар гледача з залы, які здолее завесці публіку. Часам наццатага раду. І так я... гуляю з гледачом. Таму і працую, у першую чаргу, з-за маральнага задавальнення кожнага асобнага гледача, а не дзеля сябе", — прызнаецца Косця.

Не дзіўна, што пасля прадстаўлення (а іх на дзень можа быць і тры) артыст адчувае неверагодную эмацыйную стомленасць. "Часам нават здаецца, што ўсё, хаця б на працягу тыдня буду адпачываць, паколькі даймае эмацыйная спустошанасць. А назаўтра ізноў імкнешся туды, на манеж, да гледача", — з усмешкай заўважае ён.

Нягледзячы на складанасці, з якімі давялося сутыкнуцца ў самым пачатку, Косцю вельмі падабаецца працаваць у цырку. "Мной авалодваюць прыемныя пачуцці, калі я стаю пасярэдзіне манежа і чую смех публікі, апладысменты. Мне падаецца, што гэта дае станоўчы зарад энергіі не толькі клоунам, а і ўсім артыстам, якія выступаюць пад купалам", — дзеліцца ўражаннямі суразмоўца. Ад клоуна абавязкова павінна ісці энергія ў залу. Тут існуе зваротная заканамернасць: калі артыст добра ставіцца да гледача, то і глядач адказвае артысту ўсмешкай, смехам, апладысментамі, захапленнем.

Клоун з... юрыдычнай адукацыяй

Варта памятаць пра тое, што людзі прыходзяць у цырк, каб на дзве гадзіны забыцца на свае праблемы. Таму для артыста вельмі складана назваць цырк штодзённым святам. Гэта хутчэй спецыфічная праца. Такога меркавання прытрымліваецца і мой герой. Адзначу, што ён зараз вучыцца на другім курсе юрыдычнага факультэта аднаго са сталічных ВНУ. "Прафесія клоуна, безумоўна, адрозніваецца ад працы юрыста. Галоўная асаблівасць у тым, што на манежы публіка дорыць нам добры настрой, а гэта, у сваю чаргу, аблягчае працу", — падкрэслівае Косця. Ён яшчэ дакладна не ведае, кім лягчэй быць: артыстам ці юрыстам. "Два гады таму я не мог нават уявіць, што буду клоунам. Таму казаць пра тое, што будзе праз два—тры гады яшчэ складаней", — адзначае ён.

Але адно вядома дакладна: апынуўся Косця ў цырку таму, што па жыцці ён ...клоун. Тыя людзі, якія даўно яго ведаюць, могуць пацвердзіць, што ў артыста выдатнае пачуццё гумару. Ён спрабуе жартаваць і ў паўсядзённым жыцці, але робіць гэта мягка, каб не крыўдзіць людзей.

Не існуе для артыста і куміра, чалавека, на якога ён хацеў бы быць падобным. Ён перакананы, што ад такіх знакамітасцяў, як Нікулін, Дураў, варта ўзяць адносіны да справы, ды працаваць як мага больш, паколькі ні адзін цыркавы жанр не прадстаўляе такой прасторы індывідуальнасці, як клаунада. Тут няма ні правілаў, ні нормаў. Характэрныя рысы гэтага гумару — жыццярадаснасць, галантнасць і гарэзлівасць. Марыць можна толькі пра тое, каб пры дапамозе мімікі дасягнуць высокай ступені ўпэўненасці ў тым, што выклікаеш уражанне, якое выклікала і міміка былых часоў.

А мой герой марыць пра тое, каб адпрацаваць яшчэ адну праграму, ажыццяўленне якой падаецца яму блізкай. Артыст лічыць, што варта ставіць перад сабой рэальную мэту, якой можна дасягнуць. А вось што тычыцца славы, Косця перакананы, што заяўляць пра сябе варта тут, у Мінску. "Каб стаць запатрабаваным, трэба працаваць, паколькі зроблена яшчэ зусім мала", — лічыць артыст. Магчыма, вельмі хутка, дзякуючы свайму таленту, намаганням і жаданню працаваць, ён пакорыць не толькі манеж Беларускага дзяржаўнага цырка, але і пляцоўкі замежных краін.

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Верка ЗАЦІРКА

Новыя лысагорцы

На што саспелі лысагорцы?
Ды ўжо дапетрылі і вы:
Яны ж і людзі,
і празорцы,
Ды й не гублялі галавы.

Хоць так імкне жыццё, віруе,
Настаў нервовы новы век,
Ды вас хай гэта не хвалюе —
Не памяняўся чалавек.

Як адбыліся перамены
На схілах Лысае Гары,
Тут нехта дом зляпіў
каменны,
А хтось забыўся на стары.

Ў кагосьці плот
застаўся нізкі,
Ў кагось падрос
ці ўпаў на бок,
Ды нават аўцюковец Ліпскі
Не ўзвёў яго аж да аблок.

Ды гэта ўсё, як кажуць,
звонку...
Чаму ж абачлівы Марук
Адпрэчыў дачу,
кінуў жонку?..
Адбіўся, ведама, ад рук.

А лысагорскіх
душ нявольнік —
З'явіўся побач магазін.
Якраз туды Іван Стадольнік
На дні хадзіў не раз адзін.

Вяртаўся ён бліжэй да ночы
З цяжэннай торбай
на плячы,
А Далідовіч быў ахвочы
Яму данесці памагчы.

Тут меў прытулак
Вераціла —
Свой лысагорскі Рабінзон.
Як не спалучыць розум
з сілай,
Кладзецца ўпокат на газон.

А калі зноў усчаўся лямант,
Бы не на сотках, а ў кіно,
Нібы сюды
прытупаў мамант
І біўнем грукае ў акно,

Дык гэта жонка-паэтэса
Дае раўнівых грымакоў,
Бо мужа напаткала
ў лесе
З суседкаю,
ды без грыбкоў.

Там у Мятліцкага Міколы
Не заквітнеў
чамусьці сад,
Адно паўз хату,
скрозь,
наўкола
Расце бур'ян, як вінаград.

Нібы пакутлівая
рана —
Тут столькі страчана
для Муз,
А колькі сотак
занядбана —
Як той пісьменніцкі Саюз...



Сказ пра Лысую гару – 2

(каментарый)

Новы паэтычны твор пра Лысую гару і яе насельнікаў з'явіўся на рэдактарскім стале ў той час, калі кабінет пуставаў (рэдактар быў на вёрстцы). Відаць, што аўтар, ці яго хаўруснік, цікаваў за гаспадаром рэдакцыйнага пакоя, каб неўзаметку пакласці ліст на стол. Правесці следства па высвятленні аўтарства твора, рэдактар даручыў мне, як чалавеку, які нешта кумекае ў аператыўным вышуку.

У адзін з восеньскіх дзён, я аўтастопам даехаў да Валоўшчыны і каб не прыцягваць увагу пісьменнікаў да сябе, як незнаёмца, тым больш апранутага ў спартыўныя трусы і майку, пачаў аглядаць ваколіцы лысагорскага кааператыва "Узгор'е". З агародаў, дзе каларадскія жукі даядалі чарнаваты бульбоўнік, у бінокль ля цэнтральных варот заўважыў Генадзя Шупеньку. Літаратуразнаўца і крытык трымаў у руках павадок, які цягнуў за сабою бурштынавага колеру пудзель. Як толькі Генадзь Серафімавіч знік за лістотай прыдарожных рабін, з першай, вуглавой хаты выйшаў Уладзімір Марук і прысеў на прызбу. Я хуценька прымацаваў да фотаапарата тэлеаб'ектыў і пакуль Уладзімір Антонавіч абдумваў строфы, шчоўкнуў фотазатворам, проста так, на ўсялякі выпадак.

Якраз у гэты момант да Маруковай хаты падышоў Іван Стадольнік. Ён павітаўся з калегам і патэпаў паціху наперад. Я павесіў на нос чорныя акуляры і падкраўся бліжэй да цэнтральных варот творчага паселішча. Смела пакрочыў па цяністай вуліцы. Пастаяўшы крыху каля хаты Уладзіміра Ліпскага (у градах корпаліся дачка з мужам), ціха размінуўся з Уладзімірам Скарынкіным. Яго жонка, Валянціна Пятроўна, дзіўна глянула на мяне, але не пазнала, хаця і былі добра знаёмыя.

З-пад горкі, якраз ля сядзібы Васіля Зуёнка, паказаўся Браніслаў Спрынчан. Трымаючы ў руках даўжэзны кабачок, ён сышоў на ўзбочыну дарогі і доўгі час цікаваў за мной. Я ж, пасля таго, як палюбаваўся гарышчам хаты Уладзіміра Дубовіка, у франтоне якога віднеліся лёткі для пчол, скіраваў на Лысую гару. Перад тым як ступіць на яе нагой, зірнуў на дамок з цяністай тэрасай, на якой Ірына Клімковіч і Вольга Куртаніч пілі, мабыць, халодныя напоі. Каля іх былі двое мужчын, адзін, праўда, бавіў жанчын казкамі, а другі спаў мёртвым сном на зялёным газоне.

Я ўзышоў на Лысую гару, потым узабраўся на самую высокую сасну, зноў агледзеў у бінокль пісьменніцкія соткі, але высветліць, хто хаваецца пад імем Веркі Заціркі, мне так і не ўдалося. Можа, чытач дапаможа?

Янка ЗАЛУЖНЫ
Фота аўтара



Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Каханне, верш, веласіпеды...

Лугам я іду без мэты.
Думна, светла ў галаве...
Бачу, два веласіпеды
спачываюць на траве.
Не адзін, не тры, а — два.
І — прымятая трава.

Хведар ЖЫЧКА.

Калі ўзрост даўно пенсійны,
Час блуканняў настае.
Мой маршрут
заўжды стабільны —
Праз лугі мяне вядзе.

Хоць не маю пэўнай мэты,
Спадзяюся,
што знайду
У траве веласіпеды —
Тут і вершык жа складу.
Не адзін, не тры,
а — два,
Аж хмялее галава.

Пагляджу цішком
на пару,
Што схавалася ў кустах.
І ад думак грэшных жвава
Знікну з велікам
ў руках.

Янусь МАЛЕЦ

Даравітая бабка

Піша бабка,
піша вершы, —
Раптам дар
зваліўся, —
Толькі дзіўна,
што не першы
Дзед ад іх давіўся.
"Як паслухаюць,
дык млеюць, —
Кажа паэтэса, —
Ці бліны глытаць
не ўмеюць,
Ці, хутчэй,
ад стрэсу?
Мусіць,
вобразы я вельмі
Яркія ствараю,
Трэба,
мабыць,
каб не елі,
Як сцішкі
чытаю?"

Паэтам-авангардыстам

У авангард я не хадок,
Каб нават чорт аблытаў:
Гнілы ў вас, хлопцы,
кажушок,
Хоць вельмі модна сшыты.

Хадзіць нязвыкла на руках?
Страляць нагамі ў неба?
Чакаць, што дурань скажа:
"Ах!
Вось гэта клас,
што трэба!"?

О, не! Ад творчасці такой
Крывёй паўшар'і
спухнуць —
Уніз усё-ткі
галавой...
І ад напругі можна...
пукнуць!

Кузьма ТОЙ-ЯШЧЭ

Віцязь

Крамянай восеньскай парою
Ляжу, як віцязь малады,
Пад буйнай яблыняй старою
Грызу саспелыя плады.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

Ляжыць ён,
віцязь малады,
Каня і меч згубіў,
не спіць:
Грызе пад яблыняй
плады —
Няма чым болей
закусіць.

Беларускія матывы на чыкагскім небасхіле



На беразе возера Мічыган на пачатку ліпеня больш за 150 ураджэнцаў з беларускай зямлі сабраліся ў вялікай зале вядомага на сярэднім захадзе ЗША ОРТ-інстытута, каб адзначыць 60-ю гадавіну з дня вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Спачатку прысутныя ўшанавалі хвілінай маўчання памяць тых, хто загінуў у баях за вызваленне роднага краю. Потым быў паказаны слайд-фільм аб гістарычных мясцінах Беларусі. Шмат кадраў былі прысвечаны славутым помнікам, гістарычным будынкам і незабыўным вуліцам Мінска, Гомеля, Віцебска, Брэста, беларускіх вялікіх і малых гарадоў. Паказ слайдаў адбываўся з адначасовым чытаннем вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, іншых беларускіх паэтаў.

Усхвалявана гучалі на вечары выступленні былых беларускіх партызан і вызваліцеляў Беларусі. Іх успаміны перанеслі прысутных у грозныя гады ваеннага ліхалецця, нагадалі пра тыя вялікія ахвяры, якія прынесла Беларусь на алтар Перамогі, пра мужнасць патрыётаў Радзімы.

А потым гучалі беларускія песні і песні пра Беларусь, якія выконвалі вядомыя тутэйшыя харавыя калектывы, вакалісты і барды. Некаторыя прачыталі ўласныя вершы, прысвечаныя роднаму краю.

Удзельнікі вечара з удзячнасцю ўспаміналі пра ўсё лепшае, што было ў іх жыцці на беларускай зямлі.

Другая падзея, што тычылася Беларусі і прыцягнула ўвагу шматнацыянальных жыхароў Чыкага, адзначалася на дзяржаўным узроўні. Амаль два месяцы ў "Дэйлі Цэнтры", а гэта афіцыйная рэзідэнцыя чыкагскага мэра, працавала персанальная выстаўка "Гармонія святла і колеру", прысвечаная таксама 60-годдзю вызвалення Беларусі і ў той жа час прымеркаваная да 75-годдзя з дня нараджэння і 55-годдзя творчай дзейнасці мастака Ізраіля Радунскага, які з 1990 года жыве ў Чыкага. Беларусам старэйшага ўзросту, помняцца ягоныя плакаты "Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці бессмяротны", "Шоў салдат ад Брэста да Берліна" і інш. Мінчане не забылі яго яркіх плакатаў да тэатральных спектакляў, опер, балетаў, аперэт, канцэртных праграм. Больш дзесяці разоў І.Радунскі ўзнагароджваўся дыпломамі конкурсаў на лепшы палітычны і тэатральны плакат. Гэта па ягоных праектах афармляўся Мінск да святкавання 40-годдзя Перамогі ў вайне з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У цэнтры чыкагскай выстаўкі знаходзіўся фотаздымак мастака са звесткамі пра яго жыццёвыя дарогі і творчыя дасягненні. Побач — карта Беларусі з апісаннем яе геаграфічнага становішча ў свеце і кароткай даведкай пра яе гістарычныя шляхі. І.Радунскі прадставіў на агляд свае акварэльныя працы. Гледачы адчулі гармонію малюнка, замілаванне сталіцай Беларусі, яе маленькімі гарадамі, цудоўнай веліччу Нарачы, і непаўторнай прыгажосцю блакітных азёр, старым паркам у Светлагорску, мяккім золакам над Прыпяццю.

Наведвальніца, якая аглядала выстаўку, прызналася: "Я пахадзіла сярод малюнкаў І.Радунскага і на памяць усплыло столькі светлага і радаснага з майго беларускага жыцця, што неадольна пацягнула на Радзіму. Цвёрда вырашыла для сябе — абавязкова наведаю Беларусь. Там засталіся магілы маіх продкаў. Мастак натхніў мяне на такую паездку".

Выстаўку з цікавасцю наведвалі не толькі рускамоўныя, але і карэнныя амерыканцы. Наведвальнікі пакінулі ў кнігах водгукаў шмат ўдзячных слоў у адрас таленавітага жывапісца.

Ветэраны вайны таксама выказвалі І.Радунскаму сваю ўдзячнасць за дапамогу ў афармленні кнігі ўспамінаў "Война і судьбы", у якой прадстаўлены шэраг ягоных мастацкіх прац. Яму належыць афармленне інтэр'ера-экспазіцыі "10 год трагедыі Чарнобыля" ў актавай зале чыкагскай мэрыі. Ён жа дапамог у афармленні афішы першага рускамоўнага тэатра ў Чыкага "Атрыум".

І яшчэ адна значная беларуская падзея адбылася ў горадзе на беразе Мічыгана. Тут існуе традыцыя на вялікай цэнтральнай плошчы ля скульптуры Пабло Пікасоа праводзіць выступленні мастацкіх калектываў розных этнічных груп, якія пражываюць у Чыкага. Дайшла чарга і да беларусаў. 16 ліпеня на гэтай плошчы ў прысутнасці шматлікіх гледачоў, людзей розных народаў і колераў скуры адбыўся канцэрт "Беларускія мелодыі". Сярод чыкагскіх хмарачосаў загучалі беларускае слова, беларуская музыка, беларускія спевы. Танцавальная група "Харошкі" выхаванцаў дзіцячага садка, у цудоўных нацыянальных касцюмах, з поўнай дзіцячай непасрэднасцю кружылася ў вясёлых беларускіх танцах. Пад захопленыя апладысменты гледачоў беларускія мелодыі на цымбалах выконвала вядомая цымбалістка і ксілафаністка Ірына Грыгаровіч.

Вялікі поспех выпаў і на долю барда Міхася Клейнера, ураджэнца Пухавічаў. Ён не толькі сам складае вершы, але піша музыку і на вершаваныя тэксты беларускіх паэтаў. Пад высокім чыкагскім небам у гэты дзень прагучалі ў яго выкананні песні на словы Янкі Купалы, Уладзіміра Дубоўкі, Анатоля Грачанікава, Рыгора Барадуліна і іншых беларускіх паэтаў. Натхнёна спяваў ён і песні на ўласныя вершы, прысвечаныя Беларусі. Асабліва цёпла былі ўспрыняты слухачамі ягоныя песні, прысвечаныя Мінску.

Канцэрт на цэнтральнай плошчы спадабаўся прысутным, беларускае слова так зачаравала, што афіцыйныя прадстаўнікі ўлады дамовіліся аб тым, каб такія выступленні на беларускую тэму сталі традыцыйнымі і праводзіліся ўлетку штогод.

У летнія дні Чыкага жыў і дыхаў Беларуссю. На працягу гэтых дзён многія з чыкагцаў адкрылі для сябе новую краіну, аб якой да гэтага ведалі вельмі мала альбо і ўвогуле нічога не чулі. Беларускае слова, музыка, жывапіс пастукаліся ў сэрцы чыкагцаў, раскрылі перад імі прывабны свет краіны зялёных лясоў і блакітных азёр, спагадлівых і шчырых людзей і знайшлі ў іх паразуменне і шчырую зацікаўленасць.

Цімох ЛІЯКУМОВІЧ
г. Чыкага, ЗША

Дзедавы пчолы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

кладніў Веня, — гэты прадукт не псуецца — чым даўжэй захоўваецца, тым больш мацнее.

— Аняго ж, сама пераканалася, — пацвердзіла гаспадыня, сарамліва прыкрываючы рукой апухлы твар, — толькі ў нябожчыка дзеда такі мёд быў, больш ні ў кога.

Мужчыны за чаркай яшчэ доўга гаманілі, раіліся і абмяркоўвалі, як ім хутчэй, акрамя дзедавай ліпы, ліквідаваць наступствы буры. Бо і на ферме, дзе яны даглядалі быкоў, сарвала ледзь не палову даху. Ім там яшчэ і памагатыя спатрэбяцца — удвух не дадуць рады.

Разыходзіліся позна. У начным сінім небе ярка палалі зоры, над сіратлівай, без страхі, дзедавай хатай завіс коўш Вялікай Мядзведзіцы. Шурыку падалося, што гэта нябесны пад'ёмнік наважыўся падхапіць знесеную бурай дзедаву страху ўлаштаваць на яе ранейшае месца. Нават і пасля чаркі ў яго на душы было неспакойна і скрушна з-за тых дзікіх дзедавых пчол, якія шмат гадоў вяліся ў ліпе. Яны цяпер засталіся бяздомнымі — няма старасвецкага камля, дзе здаўна жылі. І ў яго з'явілася думка — сабраць пустацелыя калодкі з камля, папілаваныя яго сябруком і разнесеныя па падворках, скласці адна на адну, прымацаваць тую дуплаватую вяршаліну, і няхай зноў туды злятаюцца пчолы. Але адразу закралася сумненне — ці збяруцца яны ў адзін рой.

Трывожныя думкі пра бяздомных дзедавых пчол непакоілі яго ўсю ноч — да раніцы не змружыў вачэй. А як развіднелася, выгнаў на пашу карову і пайшоў па падворках збіраць калодкі, якія учора з сотавым мёдам разнеслі суседзі. Паскочваў у адно месца і стаў прымяркоўваць адна да адной, каб скласці з іх вулей-калоду, падобна тым, што некалі яму ў лесе паказваў дзед Сцяпан. Яны віселі высока на дрэвах.

За гэтым заняткам і заспеў яго Веня, які, па ўчарашняй дамоўленасці, з цяслярскім рыштункам пад пахаю ішоў на ферму перакрываць знесенены бураю дах. Убачыўшы сябрука за незвычайным заняткам, спытаўся:

— І што гэта ты, Шурык, надумаў?

— Давай з гэтых калодаў на тым месцы, дзе расла ліпа, складзем вулей — мо пчолы будуць зноў весціся.

Веня пагадзіўся, і яны ўвішна ўзяліся працаваць. Абсеклі карані і закацілі на ранейшае месца пень. На яго, як і пілаваліся, роўна склалі круглякі без асяродку, на самы верх уладкавалі калодку з дуплом — так і было на старой ліпе. Адышліся ад новага пчалінага жытла, палюбаваліся здаля — абодвум спадабаўся вулей-калода.

— Даўней такіх калод багата мелася ў нашым лесе — мне дзед паказваў іх, — аглядаючы незвычайны вулей, зазначыў Шурык.

— Раней і я іх сустракаў там, ходзячы па грыбы, — адказваў з гонарам Веня і прыспешыў: — Пара, брат, нам на ферму.

Але не паспелі яны рушыць — каля іх спыніўся і злез з ровара спацелы ад язды Ігнась, дыхавічна засоп, акінуўшы нядобрым позіркам Шурыка:

— А дзе мёд з ліпы дзеўся?

— Не было тут ніякага мёду, што прыносілі тое адразу і спажывалі, — адважна схлусіў той і махнуў рукой на складзены з калодак вулей каля дзедавай хаты: — Як будзеш іх даглядаць, можа, наносяць.

— Не мані — вы ўкралі, зладзеі, мой мёд — буду падаваць у міліцыю, — не сунімаўся скнарысты Ігнась, раз-пораз выціраючы рукавом пот з твару, — у турму сядзеце.

— Па табе, браце, даўно турма плача, і мы з сябрукам можам паспрыяць, каб доўга па волі не бегаў, — прыстрашыў нязванага госця Шурык — ты незаконна прысвоіў дзедаву пасеку, а ў мяне на яе дакуменцік ёсць — стары перад смерцю выдаў.

Ігнась зніякавеў ад Шурыкавых слоў. Мітусліва падаўся на дзедаў падворак, пэўна, падымаць паваленыя бурай вуллі.

Сябры пакіраваліся на ферму правіць дах. Шурык, адыходзячы, зірнуў на складзены з калодак вулей і заўважыў, як над ім дружна кружылі пчолы. Нядобрыя думкі пасля сваркі з Ігнасем выплылі з галавы і далёка адляцелі, быццам хвіліну назад і не было іх.

Віншуем

У кастрычніку споўнілася

- 75 гадоў празаіку Міколу ГРОДНЕВУ
- 70 гадоў перакладчыку Карласу ШЭРМАНУ
- 60 гадоў публіцысту, паэту, празаіку Зіновію ПРЫГОДЗІЧУ

Жадаем юбілярам моцнага здароўя і далейшага творчага плёну.

Юбілейны каляндар

У кастрычніку споўнілася 105 гадоў з дня нараджэння Адама БАБАРЭКІ — таленавітага крытыка, які ў 20—30-я гады XX ст. прысвяціў шэраг прац творчасці Якуба Коласа, М. Багдановіча, У. Дубоўкі, М. Чарота, З. Бядулі і іншых беларускіх пісьменнікаў, распрацоўваў пытанні літаратуразнаўства і эстэтыкі, даследаваў літаратурны працэс.

95 гадоў з дня нараджэння рэпрэсіраванага паэта Сяргея РАКІТЫ, які выдаў адзін зборнік вершаў "Я агітую за пяцігодку".

95 гадоў з дня нараджэння паэткі Зінаіды БАНДАРЫНАЙ, якая выдала зборнікі "Вершы" і "Веснацвет".

І зноў жа 95 гадоў з дня нараджэння Міхася БЛІСЦІНАВА — аўтара шэрагу п'ес, сцэнарыяў мастацкіх, дакументальных і навукова-папулярных фільмаў, артыкулаў па пытаннях кіно.

Сярод стваральнікаў нацыянальнага прафесійнага тэатра, на думку вядомага тэатральнага крытыка Анатоля Сабалеўскага, быў Фларыян Ждановіч: "Лёс нібыта сам даў права Фларыяну Паўлавічу Ждановічу стаць на чале цэлага шэрагу пачынанняў, першаму пракладваць шляхі ў беларускім сцэнічным мастацтве". Сёлета адзначаем 120 гадоў з дня нараджэння Фларыяна Ждановіча — вядомага культурнага дзеяча свайго часу. За плячыма Варшаўская драматычная школа, гады актыўнай працы ў тэатральнай галіне. Ён прайшоў праз розныя этапы творчага шляху, але заўсёды, як адзначаюць крытыкі, ставіў перад сабой асветніцкія мэты — несці мастацтва людзям, даць магчымасць простаму чалавеку дакрануцца да беларускай і сусветнай літаратуры. Разам з І.Буйніцкім і У.Фальскім Ф.Ждановіч стаяў ля вытокаў стварэння Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, арганізатар і кіраўнік БДТ-1, адданы сваёй справе чалавек. Пачынаючы з мастацкага чытання, Фларыян Ждановіч усё жыццё імкнуўся несці са сцэны прыгожае беларускае слова. Высока ацэньвалі працу майстра яго калегі, віншуючы з дваццацігоддзем творчай дзейнасці: "Кожнаму з нас добра вядома, якая гэта была цяжкая і марудная работа. Толькі моцнае жаданне прынесці карысць роднаму народу магло прымусіць цябе весці яе да сягоняшняга дня". Фларыян Ждановіч быў чалавекам шматгранным — і акцёр, і рэжысёр, і педагог, але на думку спецыялістаў, па прызванні ў першую чаргу ён быў артыст. Выконваючы і драматычныя характарныя ролі, і камедыйныя, Фларыян Ждановіч паказаў сябе як акцёр шырокага дыяпазону. Пра гэта сведчыць выява майстра на фотапаштоўцы — Фларыян Ждановіч у спектаклі "Кастусь Каліноўскі" Еўсцігнея Міровіча, 1920-я гады. Паштоўка захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. На вялікі жаль, не надта многа матэрыялаў, звязаных з асобай Ф.Ждановіча музей мае, але некаторыя з іх — асабістыя рэчы, можна ўбачыць на дакументальна-літаратурнай выставе "Покліч", якая прысвечана літаратуры 20-30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Вольга ГУЛЕВА

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы Сманцар Валянціне Пятроўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

Фотамайстру Пятру Кастраме — 70

Нарадзіўся ён у Рэчыцкім раёне, у няблізкім цяпер ужо 34-м даваенным годзе. Вясковы хлопец зведаў усе цяжкасці, што выпалі на лёс яго пакалення. У вайну загінуў бацька, вёску спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі...

Пасля вайны вучыўся ў школе фабрычна-заводскага навучання і працаваў на суднабудаўнічым заводзе ў Рэчыцы, а ў 55-м стаў цаліннікам (па камсамольскай пуцёўцы) і каля 18 гадоў адпрацаваў у шахтах Караганды — праходчыкам, горнарабочым ачыстнога забою. Затым, пасля аварыі ў шахце, працягваў працоўную дзейнасць слесарам і будаўніком.

Калі ж пачалося будаўніцтва Мінскага метро, зразумеў: ёсць шанц вярнуцца на радзіму, у Беларусь. Ізноў працаваў праходчыкам, а заадно і фатаграфаваў, як аматар, першыя крокі беларускай падземкі. З фотаапаратам жа Пётр Васільевіч пасябраваў яшчэ ў Карагандзе, нават супрацоўнічаў з тамтэйшымі газетамі. На ўсё жыццё запомніўся 1979 год: ледзь не тры гадзіны "на грамадскіх пачатках" здымаў ён Пятра Міронавіча Машэрава, падчас знаёмства тагачаснага лідэра Беларусі з будаўнікамі і самім метро. Так пачаўся шлях фотамайстра да славы. Вядучыя газеты Саюза (не кажучы пра беларускія) рэгулярна змяшчалі арыгінальныя здымкі Кастрамы на першых палосах: "Правда", "Труд", "Известия"...

Пётр Васільевіч упэўнена браў прызы, дыпломы і граматы на ўсесаюзных конкурсах.

У яго унікальны фотаархіў: уся гісторыя нашага метро, а таксама "знакавыя" падзеі беларускага жыцця.

З 1997 года Пётр Кастрама ў складзе прэзідэнцкай прэс-службы вёў фоталетапіс Главы дзяржавы: ён — нязменна там, дзе разгортваюцца падзеі дзяржаўнага значэння.

— Ствараю своеасаблівы дзяржаўны архіў аб дзейнасці першага Прэзідэнта Беларусі, — з гонарам гаворыць Пётр Васільевіч. — І раблю гэта, як былы шахцёр, з усёй адказнасцю.

Нягледзячы на свой паважны ўзрост П. Кастрама і па сённяшні дзень актыўна працуе ў абраным накірунку, супрацоўнічае з газетамі і выдавецтвамі, вандруе з фотаапаратам у руках па роднай Беларусі і за яе межамі. І як вынік — новыя і непаўторныя фотаздымкі, у якіх заўсёды адчуваецца дабрыня, чалавечнасць, сардэчнасць і любоў да аб'екта, з якім працаваў фотамайстар!

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" віншуе Пятра Васільевіча з юбілеем і зычыць усіх зямных даброт.

А.К.

Фотаздымкі Пятра КАСТРАМЫ

Габрыэла МІСТРАЛЬ:

"Рэчы люблю, што ніколі не мела,
тыя таксама, што ўжо не маю."

Іван ЛАГВІНОВІЧ. *"Далёкае і блізкае"* (вершы; Баранавічы, "Творчае згуртаванне "Святліца", 2004, рэдкалегія: А.Бакач, А.Корнеў, А.Кузменка, 100 ас., 60 стар.)

Гэта ўжо не першы зборнік вершаў Івана Лагвіновіча, паэта, якога яшчэ юнаком лёс закінуў з палескага хутара Запрапасць на вугальныя шахты Данбаса. Пасляваенная бядота змушала людзей шукаць мала-мальскі заробак, хоць на зямлі, хоць пад зямлёй. Ён знайшоў яго ажно **пад** пасёлкам Тэрэз...

Там Іван Піліпавіч і захапіўся вершатворчасцю. На пачатку то была проста любоў да класічнай паэзіі, якая ачышчала душу ад задушлівага шахцёрскага шлаку. Але, назапасіўшыся *чужым* натхненнем, неўзабаве пачаў ён і сам высноўваць з арытміі ўласнага сэрца лірычныя споведзі. Праўда, па-руску. На мове тамтэйшых людскіх зносін. Аднак яго ўнутраны дух, спароджаны на беларускім Палессі, затаіўшыся на пэўны час, усё ж дачакаўся пары свайго *выбаўлення*.

Я на чужыне доўга жабраваў,
але свой бедны край не забываў.

Што, у рэшце рэшт, і змусіла паэта вярнуцца на Айчыну. Родны хутар даўно асірацеў і зарос травою. Таму Іван Лагвіновіч асеў у Баранавічах, дзе, дарэчы, даволі моцнае па правінцыйных мерках літаратурнае і культурнае грамадскае жыццё. І тут жа неўзабаве пабачылі свет яго вершаваныя зборнікі: "Разлукі выраёвыя", "Піліпаўка", "Ляда юдолі" і нарэшце — "Далёкае і блізкае". **Блізкае** аўтару, хоць ужо і *далёкае* ў часе і прасторы...

Іван Лагвіновіч даволі патрабавальны і самакрытычны чалавек, таму яго вершаваны выбар не выклікае сумневу, за выняткам тых *тэкстаў*, тэмы якіх накрэсліліся ў памяці паэта больш выразна і ўражліва, чымсьці на паперы... Але такія выпадкі лічаныя. Яшчэ адзначыў бы сур'ёзнае і ўдумлівае стаўленне аўтара да паэзіі, хоць само яе выяўленне найчасцей непрадказальнае і выбуховае. І ўсё ж выверанасць і перажывальнасць паэтычнага моманту, як і самой **завершанай** дзеі, іх цвярозае ўсведамленне — неад'емная метода высокамастацкай класічнай творчасці. Шкада толькі, што І.Лагвіновіч, маючы такі прыродны і самабытны талент, гэтак позна ўліўся ў сучасны беларускамоўны літаратурны працэс і — зноў жа — знаходзіцца ад яго на пэўным аддаленні (маю на ўвазе сталічнае жыццё з яго паўнакроўнымі творчымі сувязямі і больш актыўнымі літаратурнымі стасункамі). Зрэшты, хіба толькі ў Баранавічах аўтар можа пачувацца падобным чынам:

Мяне бянтэжаць здані й міражы
на Ленінскай, Савецкай,
Камсамольскай...
Іх нават не адпуджваюць крыжы
расейскіх цэркваў і касцёлаў польскіх.

Але паэт ведае сапраўдны кошт усяму, што пакінута продкамі ў спадчыну. Удзячнасць ім, вера ў свой заўтрашні дзень і любоў да наканаванага — вось асноўныя складнікі творчай планіды І.Лагвіновіча. Таму ўзвышаешся разам з ім, чытаючы наступныя радкі, як малітву перад прычасцем:

Зноў чую трубны
голас неба
і адчуваю цвердзь зямлі.
Збяры таго-сяго
да хлеба,
віна расстайнага налі.
Пайду я...
Трэба слёзы ўцерці,
бо я спазнаў ужо з табой
каханне,
большае за сэрца,
і, большы за каханне, боль.

Надзея САЛОДКАЯ. *"На краю зимы"* (лірыка; Мінск, 2004, выд-ва "Чатыры чвэрці", рэдактар Л.Анцух, рэцэнзент і аўтар прадмовы А.Вярцінскі, 300 экз., 88 стар.)

На фоне змястоўнай беларускамоўнай лірыкі І.Лагвіновіча выказвацца пра вершы Н.Салодкай, здавалася б, нашмат прасцей. Тым больш, што і вершы яе рускамоўныя (а дагэтуль паэтка выдавала зборнікі на роднай мове: "Я ішла да цябе...", "На ўзлёце малітвы", "Свечка жаліцца небу") і прадмова вядомага паэта А.Вярцінскага да неверагоднасці "салодкая" ("*Радуюсь этой встрече и готов уверенно повторить еще раз: на литературном небосклоне по праву появилось новое имя. Новое в лучшем, неформальном смысле этого слова. В смысле "лица необщего выражения" автора, своеобразия его лирического "я", иными словами, — новизны содержания его стихотворной строки.*") Чыста беларуская ментальная сітуацыя: змагацца за адраджэнне сваёй нацыянальнай мовы і пры гэтым падтрымліваць таварыша, які насуперак тваім перакананням піша па-руску...

Зрэшты, а хто ж яшчэ падтрымае, як не свой брат, беларус, хоць сама паэтка ўжо спадзяецца толькі на Бога:

Поддержи меня, Господи,
благости ради!
Я лечу в середине горланящих стай,
Как листок из Твоей бесконечной
тетради...
Пусть никто не сомнет его, не прочитав!

Трэба сказаць, што я не першы раз рэцэнзую вершы Н.Салодкай, ведаю станоўчыя і негатыўныя адметнасці яе паэтычнага почырку, а таксама яе творчую і стылёвую манеру пісьма. Чалавек яна таленавіты, аднак жа і не зусім цэльны, лепш сказаць, не сабраны. Асабліва тое адчуваецца падчас крызісных жыццёвых сітуацый і іх **паўторнага мастацкага перажывання**...

Противно всё: вино, бумага, осень,
Сама себе — не дура, но почти.
Уснула в шесть,очнулась ровно в восемь.
Настрой паршив и неумно-драчлив.

Гэткі настрой зразумелы, бадай, кожнаму з нас, але ці дастаткова ёміста ён па-мастацку вытрыманы і сфармаваны?.. Здараецца, што наплываюць і проста "**потусторонние**" водгукі і перапевы. Скажам, вось гэтыя радкі Н.Салодкай:

Вот пройдут фестивали,
отпляшут ансамбли,
Выпьем всё и закусим, потом
Вычтем прибыль, за сметку похвалим,
И убытки прикинем с разинутым ртом —

адразу ж выклікаюць з памяці даўнюю, але знаёма-ўражлівую страфу знакамітага сёння рускага паэта А.Чухонцава:

Мы пили когда-то —
теперь мы посуду сдаём.
В застольном сидели кругу,
упираясь локтями.
Теперь мы трезвее и реже сидим
за столом,
где нет уже многих и мы уж не те
между нами.

Альбо Н.Салодкая пачынае верш "И снова о стихах" як бы цытатай з падслуханага пра сябе, а хутчэй за ўсё, разумеючы сутнасць свайго паэтычнага захаплення: "*В таких летах стихов таких не пишут...*" І піша так:

Мои стихи и жизнь моя — обманы!?
Друг другу врут, не ведая, зачем...
В хитросплетеньях вычурно-туманных
Лишь кладезь стихотворно-вечных тем.

Тут мне чуецца голас Г.Ахматавай з яе "таемнасці рамяства":

Мне ни к чему одические рати
И прелесть элегических затей.
По мне, в стихах всё быть должно
некстати,
Не так, как у людей.
Когда б вы знали, из какого сора
Растут стихи, не ведая стыда...

Не, крый Божа, гэта не плагіят. Гэта хранічная хвароба большасці творцаў — **падсвядомы мастацкі паўтор**... Бо пішам мы не толькі ўласным лёсам, а ўсім, агулам назапашаным, духоўным інтэлектам чалавецтва. І, заўважце, чым менш адораны і дасведчаны аўтар, тым пусцей і бяздарней яго літаратурныя патугі. Асабліва ў паэзіі. Іншая справа, што натуральная праява "**наследавання**", як пазначае ў сваёй творчасці падобны прыём А.Мінкін (у дадзеным выпадку свядома), павінна захоўвацца ў падтэксце — каранях той альбо іншай аўтарскай задумы ці паэтычнай асацыяцыі... З гэтым пагаджаецца і Н.Салодкая, бо нездарма ж спрабуе *расшыфраваць* падобны творчы стан для тых, хто *разумее* паэзію механічна і прасталінейна, як зарыфмаваныя агульнавядомыя людскія думкі і пачуцці, а не як высокае духоўнае мастацтва з адпаведным метафарычным успрыманнем свету:

Умру во сне,
забывшись на рассвете,
Под светлый перезвон колоколов,
Уставшая от бичеваний плетью,
От праздных,
опустевших слов.
Мои стихи совсем не гениальны —
Заумны, может,
а порой смешны,
Сметая всё лавиною обвальной,
Вплетают в явь
пронзительные сны.

З гэтым спрачацца не выпадае. Таму будзем чакаць новых паэтычных сустрэч з Н.Салодкай. Хацелася б, вядома, каб на роднай для нас абоіх мацярынскай мове.

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3300 руб.
на 3 месяцы — 9900 руб.
Ведамасная (індэкс — 00137)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 00141)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3500 руб.
на 4 месяцы — 7000 руб.
Ведамасная (індэкс — 00135)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 11400 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 00238)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21800 руб.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Наталля ДЗЯНІСАВА,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Алесь ГАЎРОН
в. а. намесніка галоўнага рэдактара

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-79-65
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 2468
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 10.11.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1655

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12